Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ВЕРАСНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 181 (27546) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

На палігоне «Асіповіцкі» было па асабліваму горача.

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА

Студэнцкае жыццё — «урадлівая глеба» для жартаў і смешных гісторый.

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ДУБКОЎ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:

«У Беларусі прапрацоўваецца пытанне аб безумоўным вяртанні банкамі выкрадзеных з картак грошай грамадзян. Пры гэтым, вядома, трэба дакладна прапісаць сістэму, знайсці залатую сярэдзіну, пры якой будзе камфортна і банку, і спажыўцу. Плануецца правесці ў бліжэйшы час пасяджэнне, падчас якога ўсе напрацоўкі па гэтым пытанні будуць разгледжаны сумесна з праваахоўнымі органамі. Пасля гэтага будзе прынята рашэнне, якім чынам можа быць рэалізаваная сама ідэя. Магчыма, гэта будзе адпаведнае карпаратыўнае пагадненне, можа быць, спатрэбіцца фармалізацыя рашэння на ўзроўні нарматыўнага дакумента. Таксама плануецца абмеркаваць пытанні, звязаныя з павышэннем кампетэнтнасці службаў бяспекі банкаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.09.2013 г.

Долар ЗША	9050,00	▲
Еўра	12200,00	▼
Рас. руб.	283,50	▼
Укр. грыўня	1106,36	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 9°
Віцебск	+ 7°
Гомель	+ 10°
Гродна	+ 11°
Магілёў	+ 8°
Мінск	+ 9°

ISSN 1990 - 763X



ПАВЕТРАНЫЯ «БАЙКЕРЫ»

У Беларусі ўпершыню пройдзе злёт самаробных самалётаў, дэльтапланаў, парапланаў, параматораў з мэтаю паказаць і аб'яднаць пілотаў-аматараў. Адбудзецца пасяджэнне тэхнічнай камісіі, на якім пройдзе агляд лятальных апаратаў і выдача сертыфікатаў, якія пацвярджаюць бяспеку апарата і яго здольнасць да палёту.

Рыхтуецца да гэтай доўгачаканай падзеі і жыхар Смалявіч Дзмітрый Палевіч. Ён скончыў курсы лётчыкаў звышлёгкай авіяцыі, прайшоў медыцынскую камісію і даводзіць свой мотадэльтаплан да палётнай гатоўнасці.

— Я спадзяюся, што нарэшце пазнаёмлюся з большасцю беларускіх дэльтапланерыстаў. Нам будзе пра што пагаварыць, павучыцца адно ў аднаго майстэрству палётаў, падзяліцца досведам па ўдасканаленні канструкцый крыла, рухавіка і кабіны пілота, — кажа Дзмітрый, на хвіліну адрываючыся ад шліфоўкі дэталяў рухавіка. — Па сутнасці, дэльтаплан — той жа матацыкл, толькі ў паветры.

Па адукацыі Дзмітрый тэхнік-механік, але цяпер працуе прарабам на будоўлі. Жаданне лятаць у яго з'явілася яшчэ ў пачатку дзевяностых гадоў. А паднімацца ў неба навучыў больш спрактыкаваны сябра. Але толькі праз 15 гадоў набыў свой уласны дэльтаплан, удасканаліў яго і пачаў трэніровачныя палёты.

Гэты своеасаблівы авіясалон пройдзе з 27 па 30 верасня каля аграгарадка Калачы Лагойскага раёна. Адбудуцца паказальныя палёты, узнагароджанне лепшых пілотаў дыпломамі.

— Важна, што паветраных «байкераў» нарэшце афіцыйна прызнаюць і нам будзе дазволена здзяйсняць палёты ў розных рэгіёнах краіны, — кажа Дзмітрый Палевіч.

На фотаздымку: *Дзмітрый ПАЛЕВІЧ і яго 4-гадовы сын Цімафей у час падрыхтоўкі дэльтаплана ў двары свайго дома ў Смалявічах.*

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

■ Жыллё

РЫНАК У ЧАКАННІ ПЕРАМЕН...

Попыт на кватэры ў жніўні на другасным рынку істотна паменшыўся, аднак цэны працягваюць расці...

Гэтае лета адзначылася сур'ёзнай актыўнасцю пакупнікоў, калі кватэры на другасным рынку сталіцы набываліся амаль «пачкамі», а кошты ляцелі ўгору. Аднак у другой палове жніўня гэтая актыўнасць паменшылася ў некалькі разоў. Пра тэндэнцыі на другасным рынку жыллёвай нерухомасці Мінска карэспандэнту «Звязды» расказвае наш эксперт — старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктар агенцтва «БелЦТН» Мікалай Прасталупаў.

Сярэдні кошт «квадрата» аднапакаёвак дасягае 1800 долараў і больш

Яшчэ ў пачатку жніўня мінімальныя кошты на слабенькія аднапакаёвыя кватэры ў старых дамах сталіцы дасягалі 52-54 тысяч долараў. Па падобным цэнніку жылля ў горадзе ўжо не існуе. Нават самыя маленькія па плошчы аднапакаёвыя кватэры на крайніх паверхах старых пяціпавярховак прапануюцца не танней, чым за 56-58 тысяч долараў. Цяпер такія грошы запрошваюць за маламетражкі з агульнай плошчай ад 30 да 32 квадратных метраў. Падобных кватэр у інфармацыйным каталогу засталося не больш за 8-10 варыянтаў. Звычайна такія памяшканні прапануюцца толькі ў Заводскім раёне, Шабанах і кропкава ў зусім старых дамах іншых раёнаў.

За аналагічнае па плошчы і якасці жыллё ў спальных раёнах Мінска запрошваюць ужо ад 60 да 65 тысяч долараў. Атрымліваецца, што сярэдні кошт квадратнага метра маленькіх аднапакаёвак пры рэальных здзелках дасягае 1800-1850 долараў. Як толькі плошча аднапакаёвак дасягае 44 квадратных метраў (як у панэльных дамах), кошты адразу павялічваюцца ад 65 да 75 тысяч долараў.

СТАР. 5

■ На слыху

TAX-FREE АДКЛАДАЕЦЦА ДА ЗІМЫ...

Сістэма па вяртанні падатку на дабаўленую вартасць павінна была запрацаваць у краіне з 1 студзеня 2013 года. А ў пачатку верасня Міністэрства гандлю заявіла, што з восені тры асноўныя гандлёвыя пункты сталіцы — ГУМ, ЦУМ і гандлёвы дом «На Нямізе» — павінны далучыцца да Tax-Free. Як працуюць беларускія крамы па праграме кампаніі Global Blue, вызначыла карэспандэнт «Звязды».

Што такое Tax-Free?

Сістэма Tax-Free (англ. «без збораў») даступна амаль у 40 краінах свету. Яна ўяўляе сабой магчымасць вярнуць ПДВ, які ўваходзіць у кошт тавару, набытага за мяжой.

Каб афармiць чэк Tax-Free, неабходна атаварыцца ў адной краме на канкрэтную мінімальную суму. На касе разам з пакупкай вы прад'яўляеце пашпарт. Яго звесткі разам з касавым чэкам ідуць у ваш чэк Tax-Free.

Розныя краіны вызначаюць свае мінімальныя сумы тавару, якія дазваляюць афармiць чэк Tax-Free. Так, у Літве вы павінны пакінуць на касе ад 200 літаў (каля 700 000 руб.), у Польшчы — 200 злотых (каля 600 000 руб.), у Германіі — 25 еўра (300 000 руб.), у Чэхіі — 2001 чэшскую крону (каля 900 000 руб.).

Пры выездзе з краіны патрэбна прад'явіць чэк Tax-Free і пакупкі супрацоўніку мытні. Ён паставіць на ім адзнаку, якая пацвярджае вываз тавару. Каб вярнуць ПДВ, замежнік можа звярнуцца з гэтым чэкам да аператара на мытні ці ў банк сваёй краіны, які выконвае паслугу па вяртанні Tax-Free. Колькасць грошай, якую вам павінны вярнуць, залежыць ад сумы чэка. Яна вагаецца ад 7 да 20 працэнтаў ад усёй сумы.

СТАР. 5

МАГЧЫМА, ПАСАЖЫРАЎ ЦЯГНІКОЎ ВА УКРАІНУ ПАМЕЖНІКІ ПАКІНУЦЬ У СПАКОІ

Пра тое, што гэтае пытанне вырашаецца, паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Украіны ў Беларусі Міхаіл ЕЖАЛЬ на сустрэчы са спікерам верхняй палаты беларускага парламента Анатолем РУБІНАВЫМ.

Вітаючы госця, старшыня Савета Рэспублікі канстатаваў, што адносіны паміж Беларуссю і Украінай былі і застаюцца добрымі ва ўсіх сферах. Што тычыцца эканомікі, то кіраўнік верхняй палаты парламента заўважыў, што ў сучасных умовах будучыня — за сумеснымі праектамі.

— Сёння трэба так планаваць супрацоўніцтва, каб кожны адчуў зацікаўленасць. Так бывае, калі ёсць сумесная вытворчасць, — сказаў Анатоль Рубінаў. — Напэўна, іншага не дадзена, бо без аб'яднання намаганняў у сучасным свеце нічога не атрымаецца.

Беларуска-ўкраінскі тавараварот па выніках 2012 года дасягнуў амаль $8 млрд. Аднак гэта не адпавядае патэнцыялу двухбаковых адносін, лічыць Анатоль Рубінаў.

З гэтым цалкам пагадзіўся пасол Украіны. «Надышоў час гандлёва-эканамічныя адносіны памнажаць на два, у тым ліку праз сумесныя вытворчасці», — адзначыў дыпламат, назваўшы ў ліку самых перспектыўных сфер сельскагаспадарчае машынабудаванне і вагонабудаванне.

Што тычыцца начных праверак на мяжы ў цягніках, якія звязваюць Беларусь і Украіну, Міхал Ежаль назваў іх зневажальнымі і пакутлівымі для людзей, асабліва тых, хто едзе ў камандзіроўкі. «Працуем над тым, каб іх выключыць», — паабяцаў пасол.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю працу **2 кастрычніка 2013 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе адбывацца **2 кастрычніка 2013 года з 9.00 да 9.50** у фае залы пасяджэнняў.

ЛЕПШЫ КАНТРОЛЬ ЗА ЯКАСЦЮ МАЛАКА — СВЯДОМАСЦЬ

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

З вёскі Галавенчыцы Стаўбцоўскага раёна ў рэдакцыю патэлефанавала жанчына, чыя скарга пакрысе пераўтварылася ў суцэльны плач у тэлефоннай слухаўцы... Высветлілася, што мясцовым жыхарам вяртаюць назад малако...

— Першы раз гэта надарылася ў самым пачатку верасня. Потым сітуацыя паўтарылася недзе ў сярэдзіне месяца. Зараз вось днямі вярнулі малако зноў. Калі гаварыць асабіста пра мяне, гаворка ідзе пра 16-18 літраў за кожны раз, — распавяла пра бяду заяўніца. — Асабліва нічога не тлумачаць, гавораць толькі, што ў малацэ — антыбіётыкі. Толькі ў нашай вёсцы прыватных малаказдатчыкаў — недзе дзесяць чалавек. І ўсім павярталі здадзенае...

Старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў Аркадзь КАЗЯКОЎСКІ, да якога мы звярнуліся па каментарыі, пацвердзіў наяўнасць праблемы.

— Малако з нашага раёна, якое збіраецца дзвюма машынамі, паступае на першы сталічны гармалзавод. І вось адтуль сапраўды пачалі вяртаць прадукцыю, бо ў ёй знайшлі сляды антыбіётыкаў. Гэта азначае, што нехта з вяскоўцаў здае малако ад хворай каровы, — уздыхнуў суразмоўца. — І гэты «нехта», выходзіць, падводзіць усіх астатніх здатчыкаў, бо малако ў цыстэрне змешваецца і яго даводзіцца потым вяртаць усім без выключэння.

Ці можна нейкім чынам вырашыць праблему на месцы? «Толькі праз свядомасць!» — адказаў Аркадзь Казякоўскі. І патлумачыў, што калі праверыць малако на шчыльнасць, тлустасць — не праблема, дык адзін аналіз на наяўнасць антыбіётыкаў каштуе вялікіх грошай. Таму і застаецца апеляваць да сумлення вяскоўцаў.

— Пагаварыў са старшынямі сельскіх выканкамаў: каб тыя пагутарылі са здатчыкамі малака, папрасілі іх ставіцца да справы больш адказна, патлумачылі сітуацыю, у якой церпяць ні ў чым не вінаватыя людзі, — сказаў напрыканцы старшыня Стаўбцоўскага раённага Савета дэпутатаў. — З заўтрашняга дня (на момант гутаркі. — **Аўт.**)зноў пачынаем збіраць малако ад насельніцтва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ПРАМАЯ ЛІНІЯ» З МІНІСТРАМ АДУКАЦЫІ

У чацвер **3 кастрычніка, з 10.00 да 11.00**, у рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе «прамая лінія» з **міністрам адукацыі Сяргеем Аляксандравічам МАСКЕВІЧАМ**. У чым сутнасць эксперымента па ўкараненні новай галіновай сістэмы аплаты працы педагагічных работнікаў? Чаму наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі не адбіваецца на заробках педагогаў? Як вызваліць педагагічных работнікаў ад папяровай валакіты? Ці трэба ўводзіць для выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў іспыты на прафесійную прыдатнасць? Удзел у мерапрыемствах шостага школьнага дня — права ці абавязак школьнікаў? На гэтыя і іншыя пытанні адкажа наш суразмоўца.

Тэлефануйце па нумарах

(8 017) 287 18 66

і (8 017) 287 18 71

Папярэднія пытанні можна задаць па тэлефоне **(8 017) 287 17 41** або па e-mail **nikalaeva@mail.ru.**

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 29 октября 2013 г. проводит открытый аукцион № 14-А-13 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. На торги выставляется **право аренды на 99 лет 20 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в г. Минске:**

№ п/п	Месторасположение земельного участка	Площадь, га	Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.)
1	2	3	4	5	6
1	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 15 по ПДП д. Заць)	0,0827	534 565 400	60 000 000	7 161 720
2	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 16 по ПДП д. Заць)	0,0827	534 565 400	60 000 000	7 161 720
3	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 17 по ПДП д. Заць)	0,0827	534 565 400	60 000 000	7 161 720
4	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 18 по ПДП д. Заць)	0,0827	534 565 400	60 000 000	7 161 720
5	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 19 по ПДП д. Заць)	0,0827	534 565 400	60 000 000	7 161 720
6	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 20 по ПДП д. Заць)	0,0820	530 040 400	60 000 000	7 161 720
7	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 22 по ПДП д. Заць)	0,0832	537 796 250	60 000 000	7 161 720
8	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 23 по ПДП д. Заць)	0,0832	537 796 250	60 000 000	7 161 720
9	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 24 по ПДП д. Заць)	0,0832	537 796 250	60 000 000	7 161 720
10	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 27 по ПДП д. Заць)	0,0808	522 284 550	60 000 000	7 161 720
11	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 28 по ПДП д. Заць)	0,0809	522 927 100	60 000 000	7 161 720
12	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 29 по ПДП д. Заць)	0,0808	522 284 550	60 000 000	7 161 720
13	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 30 по ПДП д. Заць)	0,0809	522 927 100	60 000 000	7 161 720
14	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 31 по ПДП д. Заць)	0,0809	522 927 100	60 000 000	7 161 720
15	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 32 по ПДП д. Заць)	0,0809	522 927 100	60 000 000	7 161 720
16	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 33 по ПДП д. Заць)	0,0976	630 875 500	70 000 000	7 161 720
17	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 35 по ПДП д. Заць)	0,0987	637 988 800	70 000 000	7 161 720
18	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 36 по ПДП д. Заць)	0,0980	633 463 800	70 000 000	7 161 720
19	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 37 по ПДП д. Заць)	0,0973	628 938 800	70 000 000	7 161 720
20	ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Заць (№ 38 по ПДП д. Заць)	0,0978	632 169 650	70 000 000	7 161 720

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями.

Аукцион состоится **29 октября 2013 г. в 11^{00} по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после подписания договора аренды земельного участка;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить гражданину – не позднее одного года, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – не позднее 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 23 октября 2013 г. в вышеуказанном (графа 5 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 30 сентября 2013 г. по 23 октября 2013 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 99 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (юридическое лицо, индивидуальный предприниматель в предусмотренных законодательством случаях в течение 6 месяцев, а гражданин в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта) должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.

ФОРУМ ТВОРЧАЙ І НАВУКОВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ДЗЯРЖАЎ – УДЗЕЛЬНІЦ СНД

ЛІТАРАТУРА Ў ЕЎРАЗІЙСКАЙ ПРАСТОРЫ

Сярод дыскусій, якія вяліся падчас работы VIII Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД, асаблівую ўвагу прыцягнула работа тэматычнай панэлі «Літаратура ў цывілізацыйнай парадыгме еўразійскай прасторы». Пісьменнікі, журналісты, навукоўцы розных краін сабраліся разам, каб абмеркаваць ролю і месца літаратурнага працэсу ў культурным і грамадскім жыцці, маральны імператыў літаратуры ў сучасным свеце, развіццё выдавецкага бізнесу, перспектывы кнігавыдання ва ўмовах інфармацыйнага грамадства, развіццё міжлітаратурнага дыялогу, узаемадзеянне перакладчыкаў.

Праблемы ў розных краінах СНД у многім падобныя. У апошнія дзесяцігоддзі, відавочна, знізілася чытацкая актыўнасць. Тыражы мастацкай літаратуры настолькі нізкія, што сапраўдныя творчыя здабыткі часам аказваюцца па-за ўвагай нават літаратурнай крытыкі, не кажучы ўжо пра шараговага чытача. У няпростай сітуацыі знаходзяцца нацыянальныя літаратуры. Невялікі тыраж часопіса «Дружба народов», малая ўвага рускіх перакладчыкаў да паэзіі і прозы краін СНД, адсутнасць ранейшай прадуманай палітыкі па знаёмстве з нацыянальнымі літаратурамі праз прадукцыю выдавецтваў «Художественная литература», «Молодая гвардия», «Детская литература», «Советский писатель» — вось рэаліі, якія сёння адлюстроўваюць наш час. І тут якраз вялікую ролю адыгрываюць ініцыятывы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, сам факт правядзення дыскусій у рамках мінскага і папярэдніх форумаў навуковай і творчай інтэлігенцыі. Пра гэта і гаварылі на пасяджэнні першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія Ананіч, дарадца МФГС Ганна Сафонава, дырэктар — галоўны рэдактар выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Дружба народов» Аляксандр Эбаноідзэ, намеснік дырэктара выдавецкага дома «Звязда» — галоўны рэдактар часопіса «Нёман» Алесь Бадак, казахскі празаік Талымбек Ыбыраймы, галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Мікола Мятліцкі і шмат хто яшчэ. І, як высветлілася, кожны паасобку казаў пра тое, што, у прынцыпе, у розных краінах шмат што і робіцца. Выходзяць і перакладныя кнігі, фарміруюцца супольнасці перакладчыкаў, выдаюцца літаратурна-мастацкія часопісы і альманахі, праводзяцца «круглыя сталы» і семінары. Даволі часта многія праекты рэалізуюцца якраз з падтрымкай МФГС. Агульная выснова літаральна ўсіх выступоўцаў — быць уважлівымі да новых аспектаў у развіцці нацыянальных літаратур, развіваць перакладчыцкія стасункі, падтрымліваць ініцыятыўную і творчую моладзь. А яшчэ — развіваць агульную мастацкую інфармацыйную прастору. Невыпадкова і ў рэзалюцыю мінскага форуму, які завяршае сваю работу, патрапіла прапанова па падтрымцы беларускага кніжнага праекта «Сугучча сэрцаў».

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Пра што гаварылі ўдзельнікі форуму

Сёння заканчвае сваю работу VIII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД. У сваіх выступленнях многія з удзельнікаў гэтай міжнароднай сустрэчы творцаў і навукоўцаў падкрэслівалі, што новыя знаёмствы і прыватныя дамоўленасці, кулуарныя размовы трох мінскіх дзён маюць для іх не меншую каштоўнасць, чым вынікі працы ў тэматычных секцыях і на дзелавых пасяджэннях форуму.

Армен СМБАЦЯН, выканаўчы дырэктар Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД:

— Я неаднойчы падкрэсліваў, што МФГС — гэта міні-ЮНЕСКА для краін Садружнасці. Цудоўна, што месцам правядзення форуму, прысвечанага пытанням экалогіі, стаў Мінск. Бо экалогія — гэта чысціня ва ўсім, у тым ліку ў адносінах асоб і дзяржаў; гэта стан навакольля, гэта тое, што мы можам перадаць нашым нашчадкам. Гэта ўсё тое, што, на маю думку, ёсць у Беларусі.

У гэтыя дні шмат гаварылася аб тым, што ўвогуле можа застацца пасля нас: музеі і архітэктура, тэхналогіі і культура альбо — руіны. Як выканаўчы дырэктар адзначу каштоўнасць форуму: гэта пляцоўка для прапаноў і ідэй, якія мы потым пры дапамозе МФГС і ўлад краін — удзельніц Садружнасці ўвасабляем у жыццё.

Генадзь ВАРЛАМАЎ, прарэктар Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Украіны «Кіеўскі політэхнічны інстытут», доктар тэхнічных навук, прафесар:

— Гэты форум — восьмы па ліку. Я працаваў на шэрагу з іх і лічу, што тут завязваюцца і чалавечыя, і дзелавыя кантакты, ладзіцца супрацоўніцтва паміж установамі. Тая культурная, адукацыйная, навукова-тэхнічная прастора, якая існуе ў СНД, павінна не толькі захоўвацца, але і быць узаемна абагачальнай. Добра, што форум аб'яднала тэма экалогіі. Бо менавіта праз гэтую прызму сёння трэба разглядаць праблемы вытворчасці, тэхналогій, падыходзіць да ўсіх бакоў жыцця — з пункту гледжання экалагічнай бяспекі. Мы ў сваёй навучальнай установе адкрылі новую спецыяльнасць — экалагічны менеджмент. Гэта частка міжнароднага праекта, у якім удзельнічаюць Кіеў, Варшава, Браціслава, Масква. Спадзяёмся, што да праекта ў бліжэйшы час далучыцца і Мінск у асобе БНТУ — нашага добрага сябра і партнёра.

Кякілік АВЕЗБЕРДЫЕВА, загадчык аддзела дзяржаўнага музея Дзяржаўнага культурнага цэнтра Туркменістана:

— Я ўдзельнічала ў леташнім форуме, які праходзіў у Ашхабадзе, пазнаёмілася з калегамі з іншых краін. З многімі пашчасціла сустрэцца цяпер у Мінску. Гэта добрая пляцоўка для абмену вопытам прафесіяналаў. Прыемна, што наша секцыя, якую я умоўна назвала б «музейнай», праходзіла ў Мірскім замку. Гэта дало добрую падставу пазнаёміцца не толькі з тым, як працуюць беларускія музейшчыкі, пераняць для сябе іх напрацоўкі, але і ўбачыць жыццё беларусаў за сотню кіламетраў ад сталіцы. Гэта таксама тыя ўражанні, па якія я ехала ў Беларусь.

Ларыса РАКОЎСКАЯ.
Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Міжпарламенцкія кантакты

СУСТРЭЧНЫ РУХ

Менавіта так Віталь БУСЬКО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных сувязях, ахарактарызаваў асноўнае ўражанне па выніках паездкі ў Дзяржаву Бруней-Дарусалам, дзе 17-23 верасня праходзіла 34-я Генеральная асамблея міжпарламенцкай арганізацыі АСЕАН.

Арганізацыя АСЕАН была створана ў 1977 годзе, у 2007-м яна стала называцца Асамблеяй. Членамі яе з'яўляюцца 10 краін Паўднёва-Усходняй Азіі, а статус назіральніка маюць Еўрапейскі парламент і парламенты 10 краін, у тым ліку Беларусі.

— Размова на форуме адбылася вельмі насычаная і сур'ёзная, — расказаў журналістам Віталь Бусько. — Усе краіны, якія ўваходзяць у Асамблею, выступілі за нарошчванне нашага супрацоўніцтва. Практычна ўсе хочуць з намі супрацоўнічаць у ваенна-прамысловым комплексе, у галіне сельскай гаспадаркі. Пажаданне супрацоўнічаць у галіне навукі, тэхналогіі і адукацыі выказалі Тайланд і Сінгапур.

Беларуская дэлегацыя выказала ідэю стварэння груп дружбы паміж парламентамі краін АСЕАН і парламентам Беларусі. «Усе дэлегацыі пагадзіліся, што менавіта парламентарыі павінны стварыць прававое поле, у якім было б камфортна працаваць бізнесу, вучоным і навучальным установам», — сказаў Віталь Бусько.

Беларуская дэлегацыя на Асамблеі таксама абмеркавала і пытанні турызму. Развіццю гэтай сферы, у прыватнасці, магло б садзейнічаць адкрыццё ў Мінску пасольства Тайланда, куды апошнім часам паток беларускіх турыстаў значна скараціўся. Ужо на гэтай сесіі беларускі парламент плануе ратыфікаваць пагадненне з Сінгапурам аб бязвізавым рэжыме для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў. Падобныя пагадненні ўжо маюцца з Інданезіяй, В'етнамам і іншымі краінамі рэгіёна.

Не толькі нам цікавы гэты рэгіён, але і мы цікавыя яму, лічыць Віталь Бусько. Нездарма Беларусь параўнальна хутка набыла статус назіральніка. Да таго ж яна цяпер прадстаўляе не толькі 10 млн сваіх жыхароў, а практычна 170 млн жыхароў Мытнага саюза, што мае важную ролю ў супрацоўніцтве. Сёння, напрыклад, В'етнам вядзе актыўныя перамовы пра стварэнне зоны свабоднага гандлю з Мытным саюзам.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Падзея

АРХІТЭКТУРНАЯ БІЕНАЛЕ

Сёння ў Палацы мастацтва сталіцы адбылося адкрыццё юбілейнага X Нацыянальнага фестывалю архітэктуры. У межах мерапрыемства запланаваны конкурсы на атрыманне Гран-пры ў намінацыях за лепшую рэалізацыю будаўнічага аб'екта і за лепшы архітэктурны праект года, паведаміў старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз архітэктараў» Аляксандр КОРБУТ.

Плануецца таксама правядзенне міжнароднага конкурсу маладых архітэктараў «Леанарда», у якім прымуць удзел спецыялісты не толькі краін СНД, але і таленавітыя архітэктары з далёкага замежжа. У Палацы мастацтва будуць дзейнічаць выставы знакавых аб'ектаў Украіны, Расіі, Грузіі, Літвы, а таксама Мінска і абласных цэнтраў нашай краіны. Запланавана правядзенне майстар-класаў з вядомымі сусветнымі архітэктарамі і абмеркаванне новых тэндэнцый у сферы жыллёвага будаўніцтва гарадоў. Нацыянальны фестываль будзе дзейнічаць з 26 па 28 верасня. Уваход свабодны. Фестываль архітэктуры «Мінск-2013» праходзіць раз у два гады.

Сяргей ПАЛІНІН

■

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» 1-я очередь.

Застройщик: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Датч Стар», зарегистрировано Минским горисполкомом 09.09.2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191061436.

Местонахождение: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.

Тел. 8 (017) 306 20 90.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщик предлагает его первый объект жилой недвижимости.

Информация о проекте строительства.

Цель строительства – строительство «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» 1-я очередь.

Строительство осуществляется с выделением следующих этапов:

первая очередь строительства: 4-5 секции;

Начало строительства – август 2013 года, предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – май 2015 года.

Застройщиком получены:

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2427 от 03.08.2012 г., № 148 от 31.01.2013 г.;

- экспертное заключение № 679-15/12И от 24.08.2012 г. (Государственный комитет по стандартизации РБ РУП «ГлавГосСтройЭкспертизы»);

- разрешение на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-030/12 от 30.08.2013 г.

- договор строительного подряда № 22/06/13-Г от 22.06.2013 г., заключенный с СООО «СтройМонолит».

Информация об объекте:

Жилой дом расположен в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского г. Минска. Проектом предусматривается строительство 777-квартирного, 11-секционного, 18-20-этажного жилого дома, со встроенными объектами обслуживания населения, с подземной гараж-стоянкой на 370 м/мест, техэтажом, помещением ТС, остекленными лоджиями. Все квартиры запроектированы по принципу «свободной планировки». Принятая конструктивная схема с монолитным каркасом и заполнением ненесущих наружных и внутренних стен блоками. Наружная отделка – атмосферостойкие штукатурки с последующей окраской фасадными красками, 1-2-ой этажи – вентилируемый фасад с отделкой из керамогранита. Окна ПВХ, застекленные лоджии. В помещениях квартир чистовая отделка и покрытие пола проектом не предусматривается. Жилой дом оборудован 2 лифтами, мусоропроводом.

Помещения в доме, не входящие в состав общего имущества: помещения общественного назначения и объекты, которые служат использованию этих помещений (коридоры, тамбуры, санузлы и подсобные помещения).

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности, после ввода в эксплуатацию жилого дома и передаче дольщикам объектов долевого строительства, входят:

помещения инженерного назначения; межквартирные лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства.

В элементы благоустройства и озеленения проектом предусматривается устройство тротуаров, пешеходных дорожек, размещение площадок: детской игровой, для отдыха взрослых, сбора мусора, устройство газонов, посадка деревьев и кустарников, гараж-стоянка открытого типа.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

10 (десять) квартир по принципу «свободной планировки» от 62 до 72 кв. м: стоимость 1 кв. метра при 100% первоначального взноса 1350 (тысяча триста пятьдесят) долларов США, при 50% первоначального взноса 1400 (тысяча четыреста) долларов США, при 30% первоначального взноса 1450 (тысяча четыреста пятьдесят) долларов США;

10 (десять) квартир по принципу «свободной планировки» от 83 кв. м: стоимость 1 кв. метра при 100% первоначального взноса 1300 (тысяча триста) долларов США, при 50% первоначального взноса 1350 (тысяча триста пятьдесят) долларов США, при 30% первоначального взноса 1400 (тысяча четыреста) долларов США;

торгово-административные помещения на 1 этаже с отдельным входом: стоимость 1 кв.м 2200 (две тысячи двести) долларов США при 90% первоначальном взносе; **административные помещения на втором этаже:** стоимость 1 кв.м при 50% первоначальном взносе 1800 (тысяча восемьсот) долларов США, при 30% первоначальном взносе 2000 (две тысячи) долларов США.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты. Данные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации и при условии наличия данных квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

Условия оплаты – первоначальный взнос в течение 5 календарных дней с момента регистрации договора долевого строительства в Мингорисполкоме, рассрочка до ввода объекта в эксплуатацию.

Ознакомление дольщиков с планировками квартир, предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства, осуществляется по предварительной договоренности в рабочее время ИООО «Датч Стар» по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).

Информацию об объекте, планы квартир и нежилых помещений смотрите также на сайте инженерной организации ИООО «Стар РМ»: www.starpm.by.

■ «Узаемадзеянне-2013»

МЭТЫ — ВЫКАНАНЫ, АЦЭНКА ВЫСОКАЯ

Скончылася актыўная фаза сумеснага вучэння «Узаемадзеянне-2013» Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, якое праводзілася ў рамках стратэгічнага вучэння «Захад-2013». Нягледзячы на дажджлівае надвор'е, учора на палігоне «Асіповіцкі» было па асабліваму горача.

Паводле задумы вучэння, у адной з дзяржаў — удзельніц АДКБ адбылася дэстабілізацыя абстаноўкі. Прычына — узрастанне актыўнай дзейнасці дыверсійных фарміраванняў, міжнародных тэрарыстычных арганізацый і наёмніцкіх структур. Саветам калектыўнай бяспекі АДКБ было прынята рашэнне па аказанні гэтай дзяржаве ваеннай і ваенна-тэхнічнай дапамогі.

Адзін з магчымых варыянтаў узнікнення крызіснай сітуацыі адпрацоўвалі аператыўныя групы і вайсковыя кантынгенты ўзброеных сіл Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. Удзельнікі вучэння рабілі захады па дэблакіраванні аэрадрома, штурме будынка і вызваленні закладнікаў. Падраздзяленні шматнацыянальнай групоўкі вартавалі важныя дзяржаўныя аб'екты, вялі разведку мясцовасці, шукалі незаконныя ўзброеныя фарміраванні, арганізоўвалі і праводзілі засады.

— Не магу не адзначыць высокі ўзровень падрыхтоўкі ўсіх катэгорый вайскоўцаў, якія прымалі ўдзел у вучэнні: як афіцэраў упраўлення, так і звычайных салдатаў, — адзначыў **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН.** — Безумоўна, арганізоўваючы гэтае вучэнне, мы ставілі перад сабой некалькі мэт. Мне здаецца, што атрыманы вопыт будзе карысны не толькі для Узброеных Сіл нашай краіны, а і для ваенных ведамстваў нашых саюзнікаў. Гэта, безумоўна, унясе пэўныя карэктывы і ў аператыўную падрыхтоўку падраздзяленняў і часцей.

Асаблівасць вучэння — адначасовае сумеснае прымяненне двух складнікаў сістэмы калектыўнай бяспекі АДКБ — Рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі і Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ. Упершыню ў рамках АДКБ адбылося дэсантаванне парашутным спосабам самаходных артылерыйскіх установак.

— Вучэнні паказалі высокую зладжанасць і ўзаемадзеянне краін — удзельніц АДКБ, — падкрэсліў **начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі — першы намеснік міністра абароны Расіі генерал арміі Валерый ГЕРАСІМАЎ.** — У наступным годзе такія вучэнні пройдуць на тэрыторыі Казахстана, дзе будуць адпрацаваны пытанні аператыўнага рэагавання на тыя пагрозы, якія могуць узнікнуць у любой дзяржаве — удзельніцы АДКБ. Хутчэй за ўсё, мы адпрацуем і тыя пытанні, якім няшмат увагі надавалася ў папярэдніх вучэннях. Гэта, перш за ўсё, фарміраванне сукантынгенту і перапраўка яго ў раён аператыўнага рэагавання.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сёння возьме ўдзел у сумесным стратэгічным вучэнні ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2013». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Як чакаецца, удзельнічаць у мерапрыемстве будзе таксама Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін.

Плануецца, што кіраўнікі дзяржаў наведаюць Гожскі палігон у Гродзенскай вобласці Беларусі і ваенны палігон Хмялёўка Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі ў Калінінградскай вобласці Расіі.

— Арганізацыяй Дагавора АДКБ у апошні час вялікая ўвага надаецца развіццю і ўдасканаленню Калектыўных сіл аператыўнага рэагавання, — зазначыў **міністр абароны Арменіі Сейран АГАНЯН.** — Гэтыя вучэнні паказалі, што мы выбралі правільны кірунак. Тыя мэты, якія ставіліся напярэдадні вучэння, цалкам выкананы. Мая ацэнка вучэння вельмі высокая.

Агульная колькасць удзельнікаў вучэння — 600 чалавек. Было задзейнічана каля 60 адзінак баявой і спецыяльнай тэхнікі, а таксама да 15 адзінак авіяцыі. **Генеральны сакратар Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Мікалай БАРДЗЮЖА** пракаментаваў апошняе рашэнне кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц АДКБ, якое тычыцца дапамогі Таджыкістану:

— Размова ідзе пра ваенна-тэхнічную дапамогу. Гэта дапамога ўзбраеннем, сродкамі для аховы дзяржаўнай мяжы, экіпіроўкай для вайскоўцаў. Другі этап дапамогі — фарміраванне міждзяржаўнай праграмы, якая тычыцца тэхнічнага аснашчэння мяжы з Афганістанам. Размовы аб якой-небудзь ваеннай дапамозе ці аб перакідванні туды ваеннага кантынгенту не ідзе. У гэтым пакуль няма неабходнасці.

Напрыканцы практычных дзеянняў войскаў адбылося ўрачыстае ўзнагароджанне тых ваеннаслужачых, якія паказалі добрыя вынікі падчас вучэння.

Вераніка КАНЮТА. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Асіповіцкі раён

БЕЛАРУСКІ ПОГЛЯД З ВІЛЬНЮСА

У Вільнюсе, у галерэі Саюза мастакоў Літвы, адкрылася выстава сучасных беларускіх майстроў мастацтва «Погляд Беларусі». Экспазіцыя ўключае творы беларускіх мастакоў, якія жывуць і працуюць у Літве.

Вільня здаўна была адным з цэнтраў духоўнасці і мастацтва беларусаў. Сцены былой Віленскай народнай школы малявання памятаюць такіх славутых мастакоў беларускага паходжання, як Хаім Суцін, Міхаіл Кікоін, Павел Крэмень, Роберт Генін...

«Нас радуе гэта выстава, яе мастацкі ўзровень. Беларускія мастакі, якія жывуць у Літве, яшчэ раз паказалі свой творчы патэнцыял. Ён высокі, шматгранны, арыгінальны. Мы бачым работы сапраўдных майстроў», — сказала на адкрыцці выставы **старшыня Саюза мастакоў Літвы Эдзіта Утарыене** *(на фота ў цэнтры)*.

Свае работы прадставілі многія вядомыя беларускія мастакі. Нельга прайсці міма палотнаў цудоўнага майстра жывапісу Уладзіміра Голуба. Яго творы немагчыма збыцца з іншымі аўтарамі. Калі вы ўбачыце іх, то заўсёды будзеце ведаць, чые гэта карціны. Камбінаваць рэалізм і фантастычны свет, ствараць загадкавыя і ў той жа час пазнавальныя вобразы, размалёўваць рэчаіснасць казачнымі фарбамі — вось характэрная асаблівасць работ Уладзіміра Голуба.

Ён нарадзіўся ў Слуцку. Вось ужо шмат гадоў жыве ў Вільнюсе, але са сваёй Айчынай падтрымлівае вельмі цесныя сувязі. Уладзімір Голуб — член Саюза мастакоў Беларусі, работы майстра знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у Фондзе Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь і ў іншых музеях Беларусі, як і ў многіх галерэях сучаснага мастацтва розных краін свету.

«У мяне вы знойдзеце ўсё тое, што не модна цяпер у мастацтве: сюжэтнасць з налётам літаратурнасці, сімвалічнасць, алегарычнасць... Я па-ранейшаму ідэнтычны самому сабе», — кажа Уладзімір Голуб.

Цікавыя палотны і братоў Аляксандра і Сяргея Покладаў. Яны абодва нарадзіліся ў вёсцы Кажамякіна Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці. І хоць цяпер жывуць і працуюць у горадзе, іх сюжэты, здаецца, нават пахнуць вёскай, настолькі яны шчырыя, выкананыя з любоўю да вясковага побыту.

Мастакі Анджэй Балаховіч і Наталля Рабчук нарадзіліся ў Вільнюсе. Але ў Анджэя захавалася дзівосная сувязь з прыродай. Яго пейзажы светлыя, цёплыя. Наталля, наадварот, уся агорнута чарамі старога Вільнюса.

«Якім я бачу стары Вільнюс? Гэта адчуванне дому, настальгія па дзяцінстве. У старым горадзе мне заўсёды добра і ўтульна. У карціну са старым горадам укладаюцца ўспаміны з дзяцінства, гістарычнае асэнсаванне, узрослае з гадамі, а таксама мастацкае ўспрыманне і мастацкая тэхніка. Калі ўсё атрымалася — карціна «гучыць», грэе душу, — гаворыць Наталля Рабчук. — Храмы Вільнюса — упрыгажэнне старога горада. Але гэта не проста будынак — гэта Дом Божы. Таму ў работу ўкладаецца Адкрыццё, якое адбываецца ў маёй душы».

Выстава «Погляд Беларусі» наладжана па ініцыятыве Пасольства Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы пры падтрымцы Фонду Чурлёніса. Працягнецца яна да 3 кастрычніка. Дэвіз выставы — «Мастацтва без межаў». Думаю, што яе варта паказаць і ў Мінску.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве. Фота аўтара.

■ Крымінал

«АДДЗЯЧЫЎ» СВАЙГО «ВЫРАТАВАЛЬНІКА»

Сталічная міліцыя вышуквае мужчыну, які падазраецца ў рабаванні. Увечары ў краме па вуліцы Глебкі маладому чалавеку не хапіла нязначнай сумы грошай. Дапамог купюрамі чалавек, што стаяў у чарзе за ім. Пакупнік прапанаваў свайму «выратавальніку» разам выпіць, каб такім чынам аддзячыць таму. У двары бліжэйшага дома мужчыны распілі бутэльку гарэлкі, пасля чаго малады чалавек... збіў сабутэльніка, які толькі гадзіну таму прыйшоў яму на дапамогу, і забраў у яго грошы.

У СТАЛІЦЫ ЗАБІЛІ ХЛОПЧЫКА

Каля пад'езда дома па сталічнай вуліцы Альшэўскага мінак знайшоў скрываўленае цела хлопчыка з нажавым раненнем у грудзі... Забітым аказаўся 13-гадовы мясцовы жыхар. А літаральна праз тры гадзіны падазраваны ў здзяйсненні злачынства быў затрыманы па месцы жыхарства і дастаўлены ў Фрунзенскі РУУС. Ім аказаўся 19-гадовы непрацуючы мінчанін, які злоўжываў наркатычнымі сродкамі. Супрацоўнікам крымінальнага вышуку ён ужо даў паказанні, у тым ліку расказаў, што нож — прыладу забойства — кінуў непадалёку ад месца злачынства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Ну і ну!

І КІНУЎ СЕЙФ У ВАДАСХОВІШЧА...

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы затрымалі за крадзеж сейфа з офіса прыватнай кампаніі 24-гадовага мінчаніна.

— Малады чалавек звольніўся з яе з-за пастаянных канфліктаў з кіраўніцтвам. Пасля гэтага грамадзянін вырашыў «аднавіць справядлівасць». Прыехаўшы позна ўначы, хлопец выбіў акно на першым паверсе будынка і праз яго трапіў унутр. У памяшканні прыхапіў металічны сейф, які пагрузіў у машыну і адвёз да Чыжоўскага вадасховішча, — паведаміла **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш.** — Тут зламыснік пры дапамозе «балгаркі» распілаваў сейф папалам, аднак унутры яго, акрамя дакументаў, кніг і пячатак, нічога не знайшоў. Гэта разлавала хлопца яшчэ больш, і ён утапіў рэшткі сейфа ў вадасховішчы. Калі маладога чалавека затрымалі, высветлілася, што, акрамя металічнай скрыні, ён украў з офіса фірмы яшчэ і дарагі ноўтбук.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,
опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. № 16
строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Смолговский тракт, г. Минск:
Для привлечения к строительству по договору создания объектов долевого строительства предлагаются нежилые помещения на 1-м этаже от 30 до 80 кв.м – 2000 (две тысячи) долларов США, свыше 80 кв.м – 1800 (тысяча восемьсот) долларов США; нежилые помещения в цоколе – 1650 (тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США; 3 м/места в крытом паркинге по 35 000 (тридцать пять) долларов США.
Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости). УНП 101019973

Фермерское хозяйство «Савицкий В.В.», дело №264-7Б\2-007\5, Управляющий Журов В.А. (адрес: 247491, Гомельская обл., г. Речица, ул. Набережная, 110\12) Хозяйственный суд Гомельской области, УНП 490495377. Торги в форме конкурса по продаже имущества фермерского хозяйства «Савицкий В.В.», назначенные на 10.09.2013 **признаны несостоявшимися.** УНП 490495377

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

26 ВЕРАСНЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15729)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Будзем знаёмыя

Міхаіл ЗУЙ:

«КАБ ДЗЕЙНІЧАЦЬ, НЕ ВАРТА ЧАКАЦЬ ІДЭАЛЬНЫХ УМОЎ»

Ён жыве пад дэвізам «Не раздумвай, а рабі». Як вынік, Міхаіл Зуй ужо не адзін год паспяхова служыць Мельпамене, здымаецца ў кіно і паралельна займаецца музыкай. Купалаўскі тэатр стаў яму амаль што родным домам — тут зноў распачаўся чарговы сезон. Гурт «ili-ili» вярнуўся ў строй пасля творчага адпачынку. На падыходзе выданне новага альбома... Можна толькі радавацца за маладога чалавека, бо, як прызнаецца ён сам, менавіта тады, калі ёсць шмат цікавай працы, ён адчувае запатрабаванасць. Мы сустрэліся з Міхаілам, каб даведацца, куды можа прывесці авантурызм, дзе паказваюць цікавыя спектаклі і на што можа натхніць настальгія.

— Наколькі ведаю, у дзяцінстве вы не марылі быць акцёрам. Раскажыце, як склалася, што вы ўсё ж такі апынуліся на сцэне?

— Я марыў пра розныя рэчы, а пасля дзявятага класа стаў займацца тэатрам. Проста ў нейкі момант з'явілася думка: чаму б не паспрабаваць? Я жыву побач са 136-й школай — яна з тэатральным ухілам. Праз нейкі час гэтая справа зацягнула, і ўжо было цалкам лагічным і натуральным паступаць у Акадэмію мастацтваў. Аднак, мне здаецца, маё рашэнне было не вельмі свядомым.

— Паступіўшы ў акадэмію, вы праз год ад'язджаеце вучыцца ў Маскву. З чым гэта звязана?

— Гэта быў пэўны этап авантурызму ў маім жыцці. Пасля першага курса ў нас сабралася група студэнтаў, з якімі мы разам ставілі першыя спектаклі. І ў нашым коле ўзнікла ідэя паехаць у Маскву і паспрабаваць сябе там. Паехалі з сябрамі ў інстытут кінематаграфіі, паказаліся, і мяне ўзялі, нават забяспечылі месцам у інтэрнаце. Тады быў дабор на другі курс у майстэрню да Іосіфа Райхельгаўза. Але ў Маскве мне з самага пачатку не спадабалася. Горад не мой. Зараз вось, калі бываю там з гастролямі, то класна, а жыць там пастаянна не хацелася. Да таго ж у нас на курсе вучыліся вельмі таленавітыя людзі, але дысцыпліна амаль што адсутнічала. Было адчуванне, быццам вучоба нікому не патрэбная. Таму, правучыўшыся там год, вырашыў вярнуцца ў родную акадэмію, бо вялікае значэнне мае акружэнне, у якім ты развіваешся і фарміруешся.

— Якія ўспаміны засталіся з часоў студэнцтва?

— Мы ўвесь свой час праводзілі ў акадэміі. Яна стала для нас амаль што другім домам. Памятаю, на першым курсе пасля першага вучэбнага дня я прыехаў вечарам дадому і адразу лёг спаць, настолькі інтэнсіўным быў рытм жыцця. Трэба было амаль кожны дзень рыхтаваць эцюды, вучыць урыўкі. Так мы атрымлівалі прафесійную загартоўку. Наогул жа на нашым курсе быў своеасаблівы касцяк, дзе адзін за ўсіх і ўсе за аднаго.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Заляпілі...

ЯК ТРАЯН СТАЎ ВІРУСАМ,

або Чаго толькі не пачуеш ад студэнтаў

Напэўна, у кожнага аматара такога жанру фальклору, як анекдот, знойдзецца і колькі гісторый пра студэнтаў і выкладчыкаў. Універсітэцкае жыццё заўжды было і застаецца «ўрадлівай глебай» для жартаў і смешных гісторый. Выкладчык Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта і Інстытута журналістыкі БДУ, пісьменнік, літаратуразнаўца і крытык Пятро ВАСЮЧЭНКА — адзін з тых людзей, што захоўваюць недарэчныя выказванні айчынных «пакутнікаў навукі».

— Спадар Пятро, раскажыце, як даўно вы пачалі збіраць студэнцкія памылкі?

— Гэтыя памылкі, альбо, як я іх называю, «залепы», я пачаў запісваць гадоў 10—12 таму. Дарэчы, першынство ў гэтай справе належыць выкладчыку БДУ, знакамітаму навукоўцу Любові Тарасюк. Студэнцкім памылкам яна дала сваю назву — філанізмы (бо лічыла, што такія памылкі здараюцца выключна з-за ляноты) і публікавала іх у газеце «Літаратура і Мастацтва». Многія мае калегі сёння таксама запісваюць «залепы» на сваіх занятках. Я, у сваю чаргу, перыядычна публікую сабраны матэрыял у часопісе «Маладосць» пад рубрыкай «Клуб студэнцкага гумару».

Акрамя таго, апошні свой лекцыйны занятак я традыцыйна праводжу ў форме «Урока антылітаратуры». Я прашу студэнтаў закрыць свае канспекты і проста паслухаць, каб не паўтараць чужыя памылкі. Звяртаю ўвагу і на тое, што я — не аўтар, а толькі рэтранслятар. Аўтарамі становяцца самі навучэнцы, яны генерыруюць «залепы» на заліках, экзаменах і гэтак далей. Звычайна згаданыя хвіліны праходзяць вельмі весела, аднак студэнты ўсё адно працягваюць папаўняць маю калекцыю ўсё новымі і новымі «экспанатамі».

— А ў чым сэнс усёй гэтай працы?

— Як ужо было сказана, я не стварaю памылкі. Мая задача — сабраць, класіфікаваць і, безумоўна, асэнсаваць. Вось менавіта ў асэнсаванні я і зрабіў свой крок наперад, бо палічыў, што агаворкі, як казаў Фрэйд, з'яўляюцца па нейкай прычыне. Адной з такіх прычын я лічу рэпрадуктыўнае, гэта значыць, нетворчае засваенне ведаў студэнтамі. Што пачуў — тое і адказаў. Атрымліваецца гульня ў «сапсаваны тэлефон». Сваю ролю тут адыгрываюць чужыя альбо дрэнныя канспекты *(«Мікола Гусоўскі напісаў сваю паэму «Песня пра зубра» для Папы Рымскага Льва «ікс»)*, банальная няўважлівасць, калі студэнт назірае, як за акном кот падбіраецца да шпака, і яму, студэнту, не да маёй лекцыі. Хаця прычыны бываюць і глыбейшыя, псіхалагічныя. Да такіх памылак я адношу мадэрнізацыю. Калі на сітуацыю, напрыклад, пачатку дваццатага стагоддзя накладаюцца сучасныя рэаліі *(«Мясцовыя хлопцы папярэдзілі Лявона Задуму, што разбяруцца з ім на адной з бліжэйшых дыскатэк»)*.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

Эксперымент

Рыдары ці планшэты?

...у ліцэі БДУ пераканаліся, што трэба гнацца не за тэхнічнымі навінкамі, а за вучэбным напаўненнем

Намеснік дырэктара Ліцэя БДУ па вучэбнай рабоце Ігар ВАРАКСА расказвае пра электронныя падручнікі.

«Узброіць кожнага школьніка планшэтам!» Калі ў ЗША ўпершыню была агучана такая ідэя, тут жа сталі падлічваць: а колькі можа каштаваць дзяржаўнай казне ўсеагульная «планшэтызацыя» школы. І высветлілася, што адправіць чалавека на Марс танней, чым выдаць кожнаму амерыканскаму школьніку сучасную мабільную прыладу ў асабістае карыстанне. Так, кошт экспедыцыі на іншую планету вагаўся ад 80 да 100 млрд доларaў ЗША, а набыццё планшэтаў толькі ў першы год каштавала б дзяржаве 27,5 млрд доларaў. А паколькі школа ў ЗША — дванаццацігадовая, то за 12 гадоў для набыцця планшэтаў усім школьнікам трэба было б знайсці ў бюджэце «лішніх» 100 млрд доларaў. Ці варта казаць, што ад гэтай ідэі нават у заможнай Амерыцы адмовіліся...
Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што аналагічныя ідэі вітаюць у многіх краінах свету. Але паколькі рынак персанальных камп'ютарных прылад развіваецца надзвычай імкліва, то ўслед за ім трансфармуюцца і лозунгі. Спачатку распаўсюджаным быў лозунг «Кожнаму школьніку — па камп'ютары», затым — «Кожнаму школьніку — па ноўтбуку», цяпер «Кожнаму школьніку — па планшэце». Цікава, а пра што будуць марыць школьнікі і педагогі яшчэ праз 5—10 гадоў?

Камп'ютар, саступі дарогу!

У Ліцэі БДУ два гады таму стартаваў эксперымент па ўкараненні ў вучэбны працэс электронных кніг — навучэнцы хіміка-біялагічнага класа сталі фактычна першапраходцамі ў выкарыстанні ў адукацыйным працэсе планшэтных прыстасаванняў.

Ліцэісты атрымалі планшэты, у памяць якіх былі ўнесены электронныя версіі ўсіх школьных падручнікаў, а таксама вучэбна-метадычныя комплексы, распрацаваныя педагогамі Ліцэя БДУ. Яны змяшчалі праграмнае забеспячэнне для чытання практычна ўсіх распаўсюджаных тэкставых і графічных фарматаў, бібліятэку класічнай літаратуры на рускай і англійскай мовах (больш як 500 кніг), 44 слоўнікі на розных мовах свету і г. д.

Калі ў БДУ вызначалі, якому з персанальных устройстваў аддаць перавагу, браліся пад увагу бяспека для здароўя іх уладальнікаў, кампактнасць, невялікая вага, прастата ў выкарыстанні і зразумелы інтэрфейс. Таму выбар спыніўся на планшэтным рыдары: дзякуючы тэхналогіі «электроннай паперы» яго экран не свеціцца, не стамляе зрок, у яго няма праблем з вугламі агляду і сонечнымі блікамі.

— Паколькі час, адведзены на эксперымент, прайшоў, сёння мы ўжо можам агучыць свае высновы: 95% удзельнікаў эксперымент спадабаўся, — паведаміў **намеснік дырэктара Ліцэя БДУ па вучэбнай рабоце Ігар ВАРАКСА.** — Натуральна, нас цікавіла, а ці дапамагло ліцэістам выкарыстанне рыдараў у вучэбным працэсе? 86% далі станоўчы адказ, 9,5% іх карысць не вельмі заўважылі, а аднаму ліцэісту рыдар нават перашкаджаў, паколькі ў вучня быў больш сучасны iPad. Пры падрыхтоўцы амаль па ўсіх прадметах, асабліва па профільных, удзельнікі эксперыменту кожны дзень карысталіся электроннымі рыдарамі.

Кіраўніцтва Ліцэя цікавіла: а ці змяніўся час, які дзеці праводзяць перад маніторам камп'ютара? І вось тут усіх чакаў прыемны сюрпрыз: высветлілася, што амаль палова ліцэістаў, у якіх з'явілася ўласная «чыталка», сталі менш часу праводзіць каля камп'ютара.

— Калі мы даём дзецям гаджэт, напоўнены карыснымі матэрыяламі, камп'ютар страчвае ў іх жыцці галоўную ролю, — дзеліцца сваімі думкамі Ігар Варакса. — Аналагічныя даследаванні мы праводзілі не толькі ў эксперыментальным, але і ў кантрольным класе, дзе электронныя кніжкі мелі 16% вучняў. Аднак паколькі «чыталкі» апошніх не мелі цікавы і карысны кантэнт, то і ў вучэбных мэтах яны амаль не выкарыстоўваліся.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
26 09 2013 г.

Рыдары ці планшэты?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У выніку ў кантрольным класе вучні праводзілі каля камп'ютара тры гадзіны штодня, а ў эксперыментальным — толькі 1,5 гадзіны. Атрымліваецца, што наяўнасць планшэтных рыдараў дазваляе ўдвая скараціць час, праведзены перад вялікім маніторам — проста актыўнасць пераносіцца з камп'ютара на гаджэты.

Настаўнік фізікі Ліцэя БДУ Леанід МАРКОВІЧ дэманструе вучням у інтэрактыўным класе аптычны эксперымент.

Яшчэ адно цікавае назіранне. Было ўстаноўлена, што ў эксперыментальным класе ліцэісты ў сярэднім прысвячаюць тэлевізару 18 хвілін штодня, а ў кантрольным класе — 30 хвілін.

Чытаем па дыяганалі?

Па выніках першага этапу эксперыментальнай дзейнасці кіраўніцтва ліцэя прыйшло да высновы, што пры наяўнасці адаптаваных навучальных матэрыялаў электронныя кнігі павышаюць эфектыўнасць арганізацыі вучэбнага працэсу і аптымізуюць пазакласную і пазаўрочную дзейнасць вучняў. Аднак ёсць у выкарыстання рыдараў і свае мінусы. Адзін з іх — гэта чорна-белыя выявы на экране, якія не заўсёды падыходзяць, напрыклад, для вывучэння біялогіі, дзе пажадана бачыць усё ў колеры.

Другі мінус — павольная хуткасць работы і вялікая колькасць націскванняў для ажыццяўлення элементарных дзеянняў. Але бадай што самы галоўны недахоп — гэта цяжкасці з успрыманнем вялікіх тэкстаў. Высветлілася, што вучні эксперыментальнага класа чытаюць на 27% хутчэй за вучняў кантрольнага класа, але на 30% горш адказваюць на пытанні па змесце прачытанага твора.

— Усё ж такі калі мы гартаем падручнік ці кнігу, то ў нас працуе яшчэ і зрокавая памяць, а калі дзеці чытаюць тэксты ў рыдары, то такое чытанне адбываецца хутчэй, «па дыяганалі». Да таго ж і настаўнік не можа сказаць на ўроку: «Дзеці, адгарніце падручнік на 31-й старонцы…», каб засяродзіць усеагульную ўвагу, — дадаў Ігар Варакса.

Электронны падручнік — не аналаг папяровага

У ліцэі канстатуюць: электронныя прылады імкліва старэюць не фізічна, а маральна. Два гады таму «чыталкі» толькі пачалі з'яўляцца. А, напрыклад, ужо сёлета бацькі толькі 13 з 24 вучняў новага тэставага класа пажадалі атрымаць ліцэйскія электронныя кнігі. Астатнія ж або маюць уласныя гаджэты, або плануюць іх набыць у бліжэйшы час.

— Мы пралічылі, што пры вялікім жаданні можна было б знайсці грошы, каб набыць усім ліцэістам планшэты, але нашы вучні з кожным годам прыносяць усё больш сваіх, — заўважае Ігар Варакса. — Калі летась 83% ліцэістаў не мелі ўласных рыдараў, то зараз іх колькасць зменшылася амаль на палову. Праблема толькі ў тым, што ўсе дэвайсы — розныя: у іх розныя вытворцы, розныя функцыянальныя магчымасці, розныя аперацыйныя сістэмы. Пройдуць яшчэ год, два, тры — і электронныя прылады будуць ужо ва ўсіх.

Дырэктар Ліцэя БДУ Вадзім МАТУЛІС упэўнены, што электронны падручнік не павінен дубліраваць папяровы:

— Электронныя дапаможнікі павінны быць інтэрактыўнымі. Дзеці прыходзяць да нас і пытаюцца, ці ёсць у нас вучэбныя матэрыялы, якія можна «запампаваць». І іх не цікавяць школьныя падручнікі, якія зручна чытаць і без планшэтаў. Ліцэістаў цікавіць дадатковы матэрыял — інтэрактыўныя тэсты, відэа. Таму трэба думаць сёння, чым мы заўтра будзем напаўняць сучасныя прылады…

Між іншым, ліцэй актыўна працуе з кнігамі аўтарства сваіх выкладчыкаў: для вучэбных дапаможнікаў, што выдае ліцэй у электронным фармаце, выкарыстоўваецца фармат Epub — больш універсальны, які падыходзіць для ўсіх прылад, у адрозненне ад фармату PDF.

— Сёння настаўнікі не могуць вучыць дзяцей і быць з імі на розных ступенях развіцця, казаць, што тэхнічныя навінкі іх не цікавяць і яны будуць працаваць як раней, бо ў гэтым выпадку страціцца кантакт з вучнямі, — падкрэслівае Вадзім Матуліс.

Кіраўніцтва Ліцэя цікавіла: а ці змяніўся час, які дзеці праводзяць перад маніторам камп'ютара? І вось тут усіх чакаў прыемны сюрпрыз: высветлілася, што амаль палова ліцэістаў, у якіх з'явілася ўласная «чыталка», сталі менш часу праводзіць каля камп'ютара.

Урокі ў «Віртуальнай школе»

Увогуле ліцэй БДУ можна параўнаць з адной вялікай эксперыментальнай пляцоўкай. Вось і сёлета тут стартаваў яшчэ адзін цікавы ІТ-праект — «Віртуальная школа». Ліцэй атрымаў у падарунак ад «Ашчадбанка Расіі» чатыры інтэрактыўныя класы — па біялогіі, хіміі, фізіцы і матэматыцы. Камп'ютар, інтэрактыўны экран, праектар, абсталяванне для лабараторных доследаў, электронны мікраскоп з вэб-камерай — усё гэта аб'яднана ў адзіную сістэму. Цяпер на ўроках хіміі ў ліцэі можна праводзіць віртуальныя доследы, дадаўшы ў намаляваную прабірку неабходныя рэчывы. Што з гэтага атрымаецца, пакажа камп'ютар. На ўроках біялогіі можна дэманстраваць трохмерныя мадэлі бялкоў (іх можна нават круціць рукой на інтэрактыўнай дошцы) і праецыраваць на дошку выяву з электроннага мікраскопа. На ўроках фізікі — дэманстраваць аптычныя эксперыменты і карыстацца віртуальнай лінейкай. Прычым педагогі могуць тэсціраваць вучняў у рэжыме рэальнага часу — у кожнага вучня ёсць пульт для адказаў. Камп'ютар фіксуе ўсе адказы і можа выводзіць іх на інтэрактыўны экран.



Інтэрактыўная дошка ў дзеянні…

Мабільныя камп'ютарныя комплексы дазваляюць выкарыстоўваць тэхніку ў любым кабінеце. Таксама ў ліцэі ўсталяваны магутны сервер, які інтэгруе ў адзіную школьную сетку ўсе камп'ютарныя сродкі, што ёсць у школе, і бібліятэку лічбавых адукацыйных рэсурсаў.

Але ў старонняга чалавека, якія ўпершыню бачыць такія цуды, узнікае заканамернае пытанне: «А ці не атрымаецца так, што сучасныя тэхналогіі захопяць ліцэістаў больш, чым вучэбны матэрыял? Ці не будуць яны адцягваць іх увагу?» Аднак у ліцэі апасенні не падзяляюць. «Добраму настаўніку інтэрактыўная дошка не перашкодзіць, а дрэнаму — не дапаможа», — упэўнена адказаў Ігар Варакса.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота аўтара.

Будзь у курсе!

ІНТЭРНЭТ АДУКАВАНАСЦІ НЕ СПРЫЯЕ

Даследчыкі з ЗША вырашылі параўнаць узровень адукаванасці і здольнасць выкарыстоўваць лексічны запас у чытачоў друкаваных вырабаў і фанатычных інтэрнэт-карыстальнікаў — спажыўцоў інтэрнэт-медыйнай інфармацыі, да якіх адносяцца падпісчыкі парталаў навін, карыстальнікі сацыяльных сетак, актыўныя наведнікі форумаў і чатаў.

Удзельнікам прапанавалі тэсты на граматыку, лексіку і словаўтварэнне, а вынікі тэстаў падвергліся структурнаму лінгвістычнаму аналізу. Высветлілася, што інтэрнэт-карыстальнікі вылучаюцца меншым слоўнікавым запасам і лексікай, характэрнай для інтэрнэт-пісьма, пры якім словы і граматычныя канструкцыі трансфармуюцца ці спрашчаюцца. Яны часта вынаходзілі новыя словы, парушаючы нормы класічнага словаўтварэння. А класічныя чытачы, валодаючы больш багатым слоўнікавым запасам і лінгвістычным досведам, паказалі яўна большую здольнасць да крэатыўнага выкарыстання новых для іх паняццяў і фарміравання новых слоў.

Такім чынам, абмен хуткімі паведамленнямі і пераважнае выкарыстанне інтэрнэт-крыніц скарачае здольнасць людзей да ўспрыняцця новых слоў і ўключэння іх у свой лексікон, зрабілі выснову даследчыкі. «Наша думка пра тое, што вялікі досвед перапіскі ў інтэрнэце стварае ў людзей крэатыўны падыход да мовы і разняволвае пісьмовую мову, аказалася памылковай. Насамрэч больш гнуткае стаўленне да мовы і паспяховае ўспрыняцце новага праяўляюцца ў тых, хто чытае друкаваныя тэксты», — падсумавалі навукоўцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

На дыстанцыі

ВЫВУЧЫЦЬ МАТЭМАТЫКУ... ПА СКАЙПЕ

Механіка-матэматычны факультэт БДУ запрашае ўсіх ахвотных далучацца да дыстанцыйнага навучання ў Школе юных матэматыкаў, якое будзе даступнае на сайце www.dl.bsu.by.

— Пакуль што дыстанцыйнае навучанне разлічана на адзінаццацікласнікаў, — расказаў **дэкан механіка-матэматычнага факультэта БДУ Дзмітрый Мядзведзеў.** — Дагэтуль у нас функцыянавала толькі бясплатная вочная школа для вучняў з 5-га па 11-ы класы. Адпаведна, на нашы заняткі рэальна было патрапіць толькі мінчанам. А дзякуючы дыстанцыйнаму навучанню цяпер падрыхтавацца да паступлення зможа школьнік з любога кутка краіны. І, вядома, такім спосабам мы хочам больш інфармацыі данесці пра наш факультэт. Многія мяркуюць, што студэнты, якія навучаюцца на мехмаце, — «батаны ў акулярах», якія толькі і робяць, што гартаюць падручнікі. Але гэта стэрэатып. Наш факультэт рыхтуе выдатных спецыялістаў у ІТ-сферы, матэматыкаў-эканамістаў, навуковых супрацоўнікаў.

У чым жа заключаецца сутнасць навучання? На сайце змешчаны ўвесь курс элементарнай матэматыкі, які быў сістэматызаваны студэнтамі мехмата. У дадатак абітурыенты змогуць па спасылцы знайсці відэа-ўрокі з самымі вядомымі маскоўскімі настаўнікамі і выкладчыкамі. Акрамя тэорыі, на сайце будуць прапаноўвацца задачы для рашэння, а потым выкладвацца адказы да іх. Пасля праверкі кантрольных работ памылкі будуць тлумачыцца выкладчыкамі абітурыентам у індывідуальным парадку.

Таксама на сайце дыстанцыйнага навучання будзе дзейнічаць і форум. Такім чынам школьнікі змогуць навучацца ў працэсе камунікацыі. Да таго ж будуць выдзяляцца гадзіны, калі абітурыенты па скайпе змогуць асабіста паразмаўляць з выкладчыкамі і задаць ім свае пытанні.

Вікторыя ЧАПЛЕВА.

БУДУЧЫХ МЫТНІКАЎ ЗАПРАШАЮЦЬ... У ШКОЛУ

«Школа будучага мытніка» будзе дзейнічаць у Белдзяржуніверсітэце з лістапада па сакавік. Гэта першыя ў Беларусі курсы, скіраваныя на падрыхтоўку абітурыентаў да прафесійна-псіхалагічнай гутаркі па спецыяльнасці «Мытная справа». Арганізатарам школы выступае кафедра мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ.

Вучэбная праграма ўключае знаёмства слухачоў з гісторыяй, спецыфікай, функцыямі і асноўнымі напрамкамі дзейнасці супрацоўніка мытных службаў. Гэтыя веды дазволяць старшакласнікам не толькі псіхалагічна падрыхтавацца да гутаркі, але і вызначыцца з правільнасцю выбару будучай прафесіі.

Заняткі будуць весці выкладчыкі кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ і супрацоўнікі Мінскай рэгіянальнай мытні. Перыядычнасць заняткаў — 2 разы на месяц. Навучанне бясплатнае. Пасля заканчэння слухачам будзе выдавацца сертыфікат, наяўнасць якога ўлічваецца камісіяй пры праходжанні афіцыйнай прафесійна-псіхалагічнай гутаркі. Папярэдні запіс па тэлефоне (017) 209 57 52.

Нагадаем, што прафесійна-псіхалагічную гутарку павінны прайсці ўсе абітурыенты, якія плануюць паступаць на спецыяльнасці «правазнаўства», «эканамічнае права», «дзяржаўнае кіраванне і права», «мытная справа», «журналістыка», «міжнародная журналістыка», «міжнародныя адносіны» і «міжнароднае права».

ПРАБЛЕМЫ З ЧЫТАННЕМ «ЛЕЧАЦЦА»

Электронныя прылады для чытання кніг (планшэты, рыдары) за кошт кароткіх радкоў на экране больш эфектыўныя для людзей з дыслексіяй (праблемамі з чытаннем), чым звычайныя кнігі — так лічаць амерыканскія навукоўцы, якія апублікавалі вынікі сваёй работы ў часопісе PLOS ONE.

Дыслексія мае неўралагічную прыроду і праяўляецца ў няздольнасці хутка і правільна распазнаваць словы, засвойваць іх значэнне і навыкі правапісу. Пры такіх парушэннях у чалавека, які чытае, ёсць праблемы з разуменнем тэксту.

Навукоўцы параўналі поспехі ў чытанні з паперы і з дапамогай кішэннага камп'ютара ў старшакласнікаў, якія церпяць ад дыслексіі. Было ўстаноўлена, што школьнікі з дэфіцытам візуальнай увагі лепш і больш хутка працавалі з тэкстам на экране маленькай прылады, чым з тэкстам на паперы.

Даследчыкі мяркуюць, што менавіта кароткія радкі з невялікай колькасцю слоў (а не ўласна электронныя прылады) дапамагаюць засяродзіцца на канкрэтных значэннях, адсякаючы другасныя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

З чаго пачаць

ВІЗІТОЎКА Ў СЕЦІВЕ

ЦІ ПАТРЭБНЫ БІЗНЕСУ СВОЙ «ТВАР» У ІНТЭРНЭЦЕ?

Адсутнасць у кампаніі свайго сайта па цяперашнім часе — маветон. Для вялікіх фірм гэта проста несалідна. А для малога бізнесу ўласны сайт — нават дадатковы інструмент для адваявання сваёй нішы на рынку. Колькасць інтэрнэт-карыстальнікаў пастаянна расце і калі кампанія сёння не зробіць сваё інтэрнэт-прадстаўніцтва, то заўтра яе ніхто не знойдзе. Давайце разгледзім такі прыклад: вы — малады прадпрымальны чалавек, скажам, электрык, адкрылі сабе ІП і аказваеце людзям паслугі ад замены лямпачак да сур'ёзных электрамантажных работ. Ну а зараз нібыта задумаліся пра свой сайт.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Навошта ён?

Для пачатку пагартаем рэкламную газету. Аб'яў ад электрыкаў — безліч. Як выбраць самага надзейнага і праверанага? Я, напрыклад, калі трэба адрамантаваць камп'ютар ці заказаць установку дзвярэй, гляджу на тых, у каго пазначаны сайт. Туды можна завітаць, ацаніць асартымент, цэны, паглядзець гісторыю фірмы, дзе знаходзіцца офіс і г.д. І ў выніку выбіраю самую, на мой погляд, надзейную. А ў каго сайта няма — прабачце, хлопцы, XXI стагоддзе на дварах, трэба падцягвацца...

Па сутнасці, сайт — гэта ваша візітоўка ў інтэрнэце, на якую вы можаце спасылацца ва ўсіх сваіх аб'явах. Гэта ваш віртуальны офіс, дзверы якога адчынены для наведвальнікаў 24 гадзіны ў суткі.

Давайце падумаем, што на вашым сайце можа быць. У варыянце з электрыкам — апісанне паслуг, цэны на іх, аповед пра сябе, пра складаныя аб'екты, на якіх прыходзілася працаваць, кантакты, навіны, інфармацыя пра зніжкі і акцыі. Гэта мінімум інфармацыі, прызначанай для кліента.

А калі ісці далей і развіваць сваё прадстаўніцтва ў інтэрнэце, то можна зрабіць усё што заўгодна — ад прыёму заказаў праз інтэрнэт да паўнавартаснай інтэрнэт-крамы ці вялікага партала.

Па сутнасці, сайт — гэта ваша візітоўка ў інтэрнэце, на якую вы можаце спасылацца ва ўсіх сваіх аб'явах. Гэта ваш віртуальны офіс, дзверы якога адчынены для наведвальнікаў 24 гадзіны ў суткі.

Такім чынам, ствараючы сайт, бізнесмен можа вырашыць наступныя задачы: расказаць пра сябе і свой бізнес, даць магчымасць кліенту задаць пытанні ці нешта ўдакладніць, стварыць яшчэ адзін «кручок» для лоўлі кліентаў — з віртуальнага сецівa. Калі дзякуючы яму з'явіцца хаця б на дзясятак больш кліентаў — то гэта ўжо поспех, праўда?

Стварыў і... забыў?

Але будзе памылковым лічыць, што стварэнне сайта вырашыць усе праблемы. Калі ваш бізнес неэфектыўны ці прадукцыя неканкурэнтаздольная, то сайт наўрад ці дапаможа. Таксама не трэба спадзявацца, што сёння ты стварыў сайт за «тры капейкі», а заўтра да цябе прыйдзе мільён кліентаў. Сайт — адзін з мільёнаў у інтэрнэце, і каб яго заўважылі (ды яшчэ заўважылі патрэбныя вам людзі!) — усяго трэба ўкласці шмат сіл, часу і грошай.

Ну і, безумоўна, аднойчы стварыўшы сайт, трэба яго хоць зрэдку абнаўляць. А то заходзіш на сайт якой кампаніі — а там тэлефоны старыя, адрас офіса, з якога фірма даўно з'ехала, апошнія навіны вісяць з пазамінулага года... І адразу знікае жаданне звязвацца з такімі несур'ёзнымі таварышамі.

Як зрабіць і колькі ўкласці?

Натуральна, самы просты спосаб зрабіць сайт для свайго бізнесу — заказаць яго ў тых, хто гэта ўмее рабіць. Заплаціў грошы — і спі спакойна: табе і дызайн прыдумаюць, і ўласна сайт зробяць, і раскруцяць яго. Кошт пытання — ад некалькі соцен баксаў, у залежнасці ад таго, што вам трэба.

Другі варыянт — зрабіць сайт самастойна. Насамрэч, просценькі сайт-візітоўку зрабіць не так і складана, але трэба троху «сячы» ў камп'ютарах і патраціць пэўны час на вывучэнне гэтага пытання. У інтэрнэце бясплатна можна спампаваць так званыя «рухавікі» сайта (самыя папулярныя — WordPress і Joomla!), набыць сабе домен (скажам, elektryk.by), хостынг (месца на серверы, дзе будуць фізічна ляжаць файлы вашага сайта), прачытаць пару інструкцый, як гэта ўсё звязаць, — і вуаля, сайт гатовы! Цяпер на візітках і ў рэкламе можна пазначаць назву сайта і зрабіць сабе прыгожы e-mail: не superelektryk2013@mail.ru, а, скажам, ja@elektryk.by.

Толькі майце на ўвазе, што, згодна з беларускім заканадаўствам, хостынг павінен быць толькі беларускім. Таму размясціць сайт у Германіі ці Расіі не атрымаецца, хаця каштаваць гэта будзе трохі менш.

Давайце прыкінем, на колькі пацягне самы просценькі сайт для нашага электрыка-прадпрымальніка (пры ўмове, што мы самі ўсё будзем рабіць): «рухавік» сайта — бясплатна, домен — каля $15 за год, хостынг — каля $ 80 за год. У выніку атрымліваецца, што ў 100 баксаў за год укладваемся. Не так шмат для прадпрымальніка, праўда?

Не сайтамі адзінымі

Стварэнне сайта — гэта толькі адзін са спосабаў заявіць пра свой бізнес у інтэрнэце. А іх яшчэ вагон і маленькі вазок. Напрыклад, можна свой сайт зарэгістраваць у шматлікіх каталогах — а раптам хто з кліентаў прыйдзе адтуль?

Яшчэ адзін спосаб прывабліваць кліентаў — быць экспертам на тэматычных рэсурсах. Скажам, завесці на якім-небудзь форуме ці ў сацыяльнай сетцы раздел (галіну форуму, суполку ў сацыяльнай сетцы і г.д.) пра электрыку і там даваць людзям бясплатныя парады. Калі вас ужо будуць лічыць за аўтарытэтнага спецыяліста, то і заказы з'явяцца. Я, напрыклад, так знайшоў сантэхніка для падключэння пральнай машыны: паглядзеў, што на спецыялізаванай галіне форуму аб пральных машынах адзін сантэхнік дае слушныя парады, і напісаў яму — маўляў, прыходзьце і да нас. Тут гарантыяй якасці выступае рэпутацыя эксперта: калі праца будзе зроблена дрэнна, то і водгукі будуць адпаведныя.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Вячэрняя змена

ПАТРУЛІ ВЫХОДЗЯЦЬ НА ДЗЯЖУРСТВЫ...

Пакуль нехта хаваецца па цёмных вуглах, каб не патрапіць з бутэлькай піва або з балончыкам фарбы на вочы патрульнаму атраду, іншыя, наадварот, імкнуцца трапіць у гэты самы атрад. Моладзевыя атрады аховы правапарадку (МААП) аб'ядноўваюць ужо каля 15 тысяч хлопцаў і дзяўчат. На рэспубліканскай спартакіядзе «Акадэмія мужнасці — 2013» удзельнікі руху мелі магчымасць паказаць на практыцы, чаму яны навучыліся.

Далучыцца да «жалезных» людзей

Сёлета ўпершыню ў праграму спартакіяды быў уключаны такі від спорту, як трыятлон. Класічная дыстанцыя гэтага віду спорту прадугледжвае 3,8 кіламетра плавання, затым 180 кіламетраў велагонкі і бег на адлегласць 42,2 кіламетра. Уражвае? Відаць, нездарма трыатлетаў называюць «жалезнымі» людзьмі.

Але трэнер па трыятлоне Крысціна Рулькевіч запэўніла мяне, што пачаткоўцы ў гэтым відзе спорту пераадольваюць дастаткова сімвалічныя дыстанцыі (у параўнанні з вышэйназванымі): 100 метраў — у басейне, 4 кіламетры велагонкі і бег на 500 метраў.

Крысціна займаецца трыятлонам шэсць гадоў. Зараз яна ўжо трэнер і працуе са сваімі камандамі.

— З кожным годам трыятлон у нашай краіне набірае ўсё большую папулярнасць, — адзначае дзяўчына. — Часта на трэніроўкі запісваюцца і бацькі, што дагэтуль прыводзілі на заняткі дзяцей, але зацікавіліся трыятлонам і самі.

Як «зачараваць» парушальніка

На спартакіядзе былі названы імёны тых, з каго павінны браць прыклад юныя дружыннікі. Таццяна Рык ходзіць патруляваць віцебскія вуліцы з 2007 года. І за гэты час яна дапамагла затрымаць больш за тысячу парушальнікаў!

— Зразумела, гэта не забойцы і не маньякі, — сціпла ўдакладняе мініяцюрная і стройная дзяўчына. — Звычайна затрымліваем п'яных людзей, што чапляюцца да прахожых... Аднойчы давялося адной паўгадзіны трымаць п'янага мужчыну, які ўчыніў скандал на вуліцы.

Па словах суразмоўцы, сілу прымяняць даводзіцца даволі рэдка. Галоўная зброя, лічыць Таццяна, — гэта правільна падабраныя словы і, як гэта ні банальна, жаночыя чары. Вось і гэтага дэбашыра ўдалося амаль без праблем «датрымаць» да прыходу дапамогі.

Ёсць жаданне? Прыходзьце...

Дзмітрый Варанюк, сакратар ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі (гэта грамадскае аб'яднанне з'яўляецца арганізатарам спартакіяды), расказаў, што члены моладзевых атрадаў аховы правапарадку карыстаюцца пэўнымі льготамі:

— Напрыклад, удзельнікі руху атрымліваюць рэкамендацыі для службы ў элітных падраздзяленнях унутраных войск, структурах Міністэрства ўнутраных спраў і Міністэрства абароны, у падраздзяленнях сілавых ведамстваў, у тым ліку і ў пагранічнай службе. З «мясцовых прывілей» — даплаты да стыпендый студэнтам, што з'яўляюцца актыўнымі членамі руху, адгулы і грашовыя прэміі для працоўнай моладзі. Зноў жа, некаторыя гарадскія камітэты даюць дружыннікам права бясплатна наведваць кінатэатры і прадастаўляюць зніжкі на абанементы ў трэнажорныя залы.

Па словах Дзмітрыя, каб стаць дружыннікам, патрабуюцца жаданне, адсутнасць шкодных звычак і добрая фізічная падрыхтоўка. Спецыяльнага экзамену не прадугледжана, але звычайна будучыя дружыннікі праходзяць псіхалагічную гутарку. Як правіла, да моладзевых атрадаў аховы правапарадку далучаюцца студэнты ці маладыя супрацоўнікі прадпрыемстваў, але ёсць сярод іх і школьнікі, якія хоць і не маюць права на патруляванне вуліц, затое могуць сачыць за парадкам у сваёй школе.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

Увага, конкурс!

«МЫ — ТАКІЯ!..»

А раскажыце — якія?!.

Што рабіць, калі ты ведаеш родную мову, карыстаешся ёю, а рука сама цягнецца да нататніка ці клавіятуры, каб зафіксаваць тое, што цікавіць, хвалюе? Што рабіць, калі ты адчуваеш нейкую магію ад друкаваных радкоў ужо не толькі як чытач?..

Вядома ж, пісаць! Спрабаваць свае сілы ў такой пакуль яшчэ нязведанай, але прывабнай сферы, як журналістыка! Пісаць і дасылаць свае творчыя працы ў «Чырвонку», якая **сумесна з Міністэрствам адукацыі абвяшчае чарговы конкурс для юных і маладых няштатных аўтараў** (на папярэдні, пад назвай «Новы погляд», прыйшло шмат допісаў, а ўсе тыя пачаткоўцы, якія актыўна супрацоўнічалі з рэдакцыяй на працягу года, паступілі на факультэт журналістыкі). «Мы — такія!..» Гэтую назву па рашэнні рэдкалегіі конкурс атрымаў сёлета. Сапраўды, якія вы, сучасныя моладзь?.. Вось пра гэта і раскажаце ў сваіх матэрыялах.

Адзіная просьба: не прыцягвайце «за вушы» тэму, не «выцягвайце» інфармацыю з інтэрнэту. Зірніце на свет свежым вокам! Вакол нас столькі незвычайных людзей, адбываецца столькі ўсяго цікавага! Раскажыце пра канкрэтнага чалавека, які зацікавіў вас сваім лёсам ці, напрыклад, незвычайным хобі. Магчыма, вы ведаеце старажыла, які падзеліцца сваімі ўспамінамі пра даўнія часы: раскажа пра гісторыю краю і людзей, што некалі жылі і працавалі тут? Ці вы самі сталі ўдзельнікам цікавых падзей: ад турыстычнага паходу да ўдзелу ў школьнай бізнес-кампаніі? Бачыце, колькі тэм навокал!..

У якім жанры пісаць? Ды ў якім заўгодна: усе матэрыялы добрыя, акрамя нецікавых. Рэпартаж, інтэрв'ю, эсэ, замалёўка — выбар за вамі. Лепшыя допісы будуць надрукаваны на старонках «Чырвонкі».

Па выніках конкурсу трох пераможцаў чакаюць памятныя прызы. Калі нехта з іх збіраецца ў наступным годзе паступаць на факультэт журналістыкі — атрымаюць ад рэдакцыі яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Свае творчыя працы дасылайце на электронны адрас газеты: konkurschz@mail.ru у фармаце rtf (магчымыя ілюстрацыі або фотаздымкі — асобным далучаным файлам) з абавязковай пазнакай **«На конкурс «Мы — такія!..»** Або ў пісьмовым выглядзе на адрас «Звязды» (220013, г.Мінск, вул. Б.Хмяльніцкага, 10А) з той жа пазнакай.

Абавязкова напішыце пра сябе: узрост, месца працы ці вучобы, і колькі слоў пра свае захапленні, яшчцёвыя памкненні. Пазначце кантактныя нумары тэлефонаў, па якіх з вамі можна будзе звязацца. Для налічэння ганарару, калі ваш матэрыял з'явіцца на старонках газеты, укажыце для бухгалтэрыі свой паштовы адрас (з індэксам), пашпартныя звесткі (кім і калі быў выдадзены, нумар, асабісты нумар (доўгі радок з лічбаў і літар), сваё імя, імя па бацьку, прозвішча. Уся гэтая інфармацыя павінна быць пададзена на рускай і беларускай мовах. Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.

Паверце, тых, хто прайграе, у конкурсе не будзе. Зычым творчых поспехаў!

Рэдакцыя «Чырвонкі».

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
26 09 2013 г.

Свой стыль

Дзмітрый ШАШАЛЕВІЧ:

Я НЕ «ВОГЕР», Я — ТАНЦОР

Дзмітрый Шашалевіч — выкладчык танцавальнай студыі «El Gato», удзельнік каманды «Дэтройт», родапачынальнік у Беларусі танцавальнага кірунку «вог» (vogue). Нядаўна Дзіма вырашыў пакінуць танцавальную студыю і засяродзіцца на развіцці сольнай кар'еры танцора-фрыстайлера. Карэспандэнт «ЧЗ» сустрэўся з тытулаваным «вогерам», які распавёў, як модны жаночы часопіс стаў танцам, хто такія Stewie Ho і Dmitry Ninja і як прайшоў першы «вог»-баль у Беларусі.

— Раскажы, калі ласка, чаму ты вырашыў спыніць трэнерскую дзейнасць і менш увагі надаваць камандзе з «Дэтройту»?

— Не было нейкай адной прычыны. Шмат фактараў супала. Паступова шляхі ўсіх удзельнікаў каманды сталі разыходзіцца. Хтосьці абзавёўся сям'ёй і часова «выпаў» з танцаў, хтосьці засяродзіўся на харэаграфіі, пакінуўшы фрыстайл... Мы пачыналі як вулічная каманда, а ў выніку пераўтварыліся ў камерцыйны праект. Да таго ж стала складана сумяшчаць трэнерскую дзейнасць і актыўнае жыццё танцора. Я ўвесь час у раз'ездах — выступленні на фестывалях, майстар-класы ў розных гарадах і краінах... Вяртаешся стомлены ў Мінск — і адразу на трэніроўкі да падапечных. Гэта стамляе і фізічна, і псіхалагічна.

У ЗША гэтым кірункам займаюцца хлопцы. Дзяўчына, якая танцуе «вог», для іх — нонсэнс. Экзотыка! У нас — наадварот.

— І што ты збіраешся рабіць далей?

— Стаўлю перад сабой мэту — стаць «топавым» танцорам, вядомым не толькі ў суседніх краінах, але і ў далёкім замежжы. Мой узровень як фрыстайлера досыць высокі для Беларусі, Украіны, Расіі і Прыбалтыкі, але для Заходняй Еўропы і ЗША гэтага недастаткова. Трэба развівацца як сольнаму танцору, удасканальваць сваё майстэрства, так што цяпер я буду трэніраваць толькі сябе.

— Перавагу аддасі «вогу»?

— Напэўна, так. Але і на іншых кірунках я не стаўлю крыж. Я — не «вогер», а танцор! Люблю танцаваць хіп-хоп, хаус і нават дэнсхол. Проста так склалася, што як «вогера» мяне ведаюць больш. Тут яшчэ ўзнікае блытаніна з танцавальнымі нікнэймамі. Іх у мяне два: у «вог»-культуры я — Dmitry Ninja, а ў андэграўнд-асяроддзі — Stewie Ho. Бывае, калегі забываюць пра гэта, і для іх я часова знікаю з «радараў». Насамрэч, я дзесьці ў Піцеры выступаю на «вог»-балі як Dmitry Ninja, а мяне шукаюць як Stewie Ho (*усміхаецца*).

— Навошта патрэбны нікнэймы ў «дэнс»-асяроддзі?

— У нас не так шмат крэатыўных імёнаў, як у той жа Амерыцы. Паўтараў не пазбегнуць. Бо навокал усе — вовы, мішы, дзімы. Нікнэйм у танцах — гэта своеасаблівае альтар-эга. Для свайго першага «ніка» я абраў імя персанажа з амерыканскага мультсерыяла пра сямейку Грыфінаў — Сцьюі. А прыстаўка «Но» ўзнікла тады, калі я выбіраў паміж двума кірункамі — хаусам і хіп-хопам. Не мог вызначыцца і ўзяў па літары ад кожнага. Атрымалася «хо» — Сцьюі Хо. Другі нікнэйм узнік пазней. У «вог»-культуры першы кампанент — заўсёды імя ці, напрыклад, вытворнае ад прозвішча, а другая частка паказвае на «дом», да якога ты адносішся. Я ўваходжу ў вялікую сям'ю House of Ninja, таму — Dmitry Ninja.

— Атрымліваецца, ты танцаваў хіп-хоп, хаус і пакуль што нічога не ведаў пра «вог»...

— А потым на «юцюбе» наткнуўся на ролік: каманда ў шыкоўных касцюмах танцавала нешта незнаёмае. Я стаў пераймаць пэўныя рухі, асабліва рукамі, і ўстаўляць іх у хаус. Тое, што гэта асобны стыль, я і не ведаў. Пазней у Парыжы выпадкова трапіў на майстар-клас да сусветна вядомага танцора Бэні Нінджа (Benny Ninja), які і пазнаёміў мяне з гэтым танцам. Хаця, ведаеце, гэта не проста танец, а асобны свет — спалучэнне моды, пластыкі і харэаграфіі. Гэта ўсё настолькі захапіла мяне, што я часова адышоў ад вулічных танцаў і цалкам прысвяціў сябе «вогу», вывучаючы не толькі танцавальныя азы, але і гісторыю ўзнікнення гэтага стылю.



— Чым яна адметная?

— «Вог» узнік на пэўным сацыяльным падмурку. Гэта былі вялікія супольнасці людзей, часцей за ўсё асобы нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі, якія прымалі ў сваю «сям'ю »тых, хто апынуўся на вуліцы. Давалі ім дах над галавой, уладкоўвалі на працу, засцерагалі ад дурных уплываў. А выхад сваёй энергіі і крэатыўнасці знаходзілі ў балях: апраналіся ў яркія касцюмы і капіравалі пад музыку позы мадэляў з глянцавых часопісаў. Так і ўзнік танец «вог».

Гэты танец вучыць любіць сябе. Ты пачынаеш больш разумець сваё цела, адточваеш свой стыль, бо з'яўляецца інтарэс да моды, вучышся падаваць сябе.

— З цягам часу аб'яднанні ў «дамы» не страцілі сваёй значнасці?

— Не. Змяніліся сацыяльныя ўмовы, «вогам» сталі займацца звычайныя хлопцы і дзяўчаты. Толькі аб'ядноўвацца яны сталі ўжо не дзеля выжывання, а дзеля паспяховых выступленняў на танцавальных спаборніцтвах і балях. Прыналежнасць да пэўнага «дому» — гэта як знак якасці, які гарантуе, што цябе заўважаць і ацэняць па заслугах. Зараз існуе вялікае мноства «дамоў», самыя вядомыя Extravaganza, Mizrahi, Prodigy, Omni і іншыя. Кожны з іх мае свой статус, самы высокі з якіх Iconic. Мой «дом», напрыклад, цалкам называецца Legendary House of Ninja. Але ён таксама «круты» (*смяецца*).

— «Вог», напэўна, кардынальна змяняе танцора?

— Так і ёсць. Магу меркаваць па сабе і па сваіх падапечных. Гэты танец вучыць любіць сябе. Ты пачынаеш больш разумець сваё цела, адточваеш свой стыль, бо з'яўляецца інтарэс да моды, вучышся падаваць сябе. «Вог» разнявольвае. Танцоры становяцца больш адкрытымі, камунікабельнымі, пашыраецца кола знаёмых, змяняюцца інтарэсы і прыярытэты. «Вогерская» тусоўка — гэта вельмі весела, паверце.

— Не памылюся, калі скажу, што ў нас «вог» танцуюць выключна дзяўчаты?

— Так. Хлопцы лічаць, што ён як стрыпдэнс ці бэйлі-дэнс — жаночы стыль. Але гэта стэрэатып. У ЗША гэтым кірункам займаюцца хлопцы. Дзяўчына, якая танцуе «вог», для іх — нонсэнс. Экзотыка! У нас — наадварот. Трэба разумець, што ў «вога» ёсць розныя падстылі. Напрыклад, у old way і new way ты можаш выбіраць, з якой падачы табе танцаваць — мужчынскай ці жаночай. А ёсць асобны падстыль femme vogue, у якім усе рухі дакладна жаноцкія. Права выбару за вамі. Дарэчы, у пачатку свайго танцавальнага шляху я няправільна разумеў сутнасць «вога». У мяне атрымлівалася нешта занадта манернае — карыкатура замест танца. А потым мне патлумачылі, што я магу танцаваць больш жорстка, брутальна, і я стаў дадаваць рэзкія рухі, «кулакі», іншыя «фішкі». Тым не менш я не баюся эксперыментаваць — у адзенні, прычосцы, грыме. І калі я выйшаў на сцэну ў кілце, гэта не значыць, што і ў жыцці я нашу спадніцы (*усміхаецца*).

— Сутыкаўся з кпінамі, недарэчнымі каментарыямі ў свой адрас?

— Шчыра кажучы, не. У танцавальным асяроддзі ўсе разумеюць, што танец — гэта вобраз. І калі я дазваляю сабе нешта незвычайнае — выкарыстоўваю больш грацыёзныя, мяккія рухі — гэта не значыць, што я адчуваю сябе дзяўчынай. Гэта эпатаж, прыкол!

— Улетку ты з калегамі арганізаваў першы «вог»-баль у Беларусі. Як ён прайшоў?

— Мяне прыемна здзівіла спонсарская падтрымка. Ніхто, да каго мы звярнуліся, не адмовіў. Атрымалася пасупрацоўнічаць з касметычнымі кампаніямі, салонамі прыгажосці, вядомымі стылістамі. Яны дапамаглі нам зрабіць яркае фэшн-шоу. Мерапрыемства было тэматычным — выпускны баль. Дзяўчаты з фантазіяй падышлі да выбару касцюмаў. Танцавальны конкурс атрымаўся непрадказальным, з інтрыгай: у розных катэгорыях — розныя пераможцы. Суддзёй у нас была Natalia Mafia — мая добрая знаёмая і аўтарытэтная танцорка, якая прыехала да нас з Ніжняга Ноўгарада. У наступны раз таксама будзем спрабаваць прывезці ў Мінск танцораў з іменем, каб яны пабачылі наш прыгожы, сучасны горад і зразумелі, што тут таксама развіваецца «вог».

— Ты заўсёды з такой цеплынёй ставіўся да сталіцы ці з цягам часу навучыўся цаніць родны горад?

— Чым больш я падарожнічаю па свеце, тым больш пераконваюся ў тым, што люблю Мінск і хачу тут жыць. Але, разам з тым, добра мець магчымасць выязджаць у іншыя краіны, наведваць «топавыя» танцавальныя мерапрыемствы, абменьвацца вопытам з замежнымі калегамі. Танцору без гэтага ніяк!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

«КАБ ДЗЕЙНІЧАЦЬ, НЕ ВАРТА ЧАКАЦЬ ІДЭАЛЬНЫХ УМОЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Тое, што вы па размеркаванні прыйшлі ў Купалаўскі, можна лічыць удачай?

— З усіх мінскіх тэатраў я найбольш хацеў трапіць у Купалаўскі. Хоць і разумею, што магло па-рознаму скласціся. На апошнім курсе мы ўжо збольшага прыкідвалі, дзе хто можа апынуцца, і, калі даведаліся пра супадзенне рэчаіснасці з нашымі прагнозамі, то, безумоўна, узрадаваліся. Тым больш што і ў Купалаўскі мы прыйшлі ў складзе шасці чалавек, таму было лягчэй, бо адчувалася сяброўская падтрымка.

— Як вас прынялі ў калектыве і чаму вы навучыліся ў старэйшых калег?

— У нас у тэатры пануе такая атмасфера, калі не адчуваеш, што прыйшоў на працу. Недарэмна ж кажуць: Купалаўскі — гэта сям'я. Там, напрыклад, няма такой моцнай барацьбы за ролю, каб цябе маглі «падставіць». Калі толькі прыйшоў пасля акадэміі ў тэатр, мяне пачалі ўводзіць у спектакль «Жанііца не журыцца», дзе я іграў Мікіту. Тады пашчасціла папрацаваць з Андрэем Андросікам. Бывала, на рэпетыцыі дае ён мне задачу нейкую, а я ў адказ: «Трэба падумаць. Настроіцца». І чую: «Бяры і рабі!» Таксама прыйшло вельмі важнае разуменне таго, што не варта баяцца памыліцца. Акцёр можа шмат разоў сыграць дрэнна, але аднойчы ў яго абавязкова ўсё атрымаецца. У тэатры вучышся з кожным спектаклем. У тым ліку чалавечым адносінам. Асабліва падчас гастроляў, калі па-новаму адкрываеш для сябе калег, іх лёсы і біяграфіі.

— Ці часта бываеце ў тэатры ў якасці гледача?

— Рэдка. Гэтым летам удалося паглядзець шмат выдатных спектакляў падчас гастроляў. Мы былі на Чэхаўскім фестывалі, дзе паглядзелі монаспектакль «Рауль» Джэймса Цьерэ. Потым былі на фестывалі ў румынскім горадзе Сібіу. Гэты гарадок сам па сабе невялікі, але за дзевяць фестывальных дзён там адбылося больш за тры сотні розных тэатральных падзей. Асабліва ўразіў спектакль «Стол» нашых калег з Польшчы. Мы нават думалі пра тое, каб прывезці яго ў Мінск. Як бачыце, «акультурваемся» на гастролях.

— А як вы ацэньваеце сучасны стан беларускага тэатра?

— Размовы пра знікненне тэатральнага мастацтва ідуць даўно. На мой погляд, тэатру сёння проста не хапае разнастайнасці. Складваецца ўражанне, што існуюць два лагеры: тыя, хто працуе ў рэпертуарным тэатры, і тыя, хто спрабуе рабіць эксперыментальныя пастаноўкі. Яны быццам кожны сам па сабе. Некаторыя кажуць, што ў Купалаўскім не можа быць нічога добрага, бо мы — рэпертуарны тэатр. А вы спачатку прыйдзіце і паглядзіце! Трэба, каб было ўзаемадзеянне паміж усімі ў тэатральнай прасторы, тады і з'явіцца нешта новае і цікавае. А калі кожны лічыць толькі сябе геніяльным, то не будзе руху наперад.

— Давайце звернемся да вашай музычнай творчасці. Што змянілася ў вашым гурце «ili-ili» пасля творчай паўзы?

— Усё! Прыйшло разуменне і бачанне многіх момантаў, на якіх раней не акцэнтавалі ўвагу. Напрыклад, сталі заўважнымі недахопы старых песень. Большае значэнне набыло гучанне, песні ствараем па змесце і па настроі зусім іншыя. Адчуваецца, што мы сталеем і змяняемся. Хочацца рабіць усё яшчэ лепш, чым было раней.

— Летась вы выпусцілі альбом «Past Perfect». Ці варта чакаць прыхільнікам новы дыск?

— Зараз мы працуем над запісам новага беларускамоўнага альбома. Плануем у снежні зладзіць канцэрт з прэзентацыяй дыска. Год таму мы былі ў Францыі. І перад ад'ездам прынялі рашэнне, што папрацуем над новым матэрыялам. Пачалі там складаць песні. А пакольні былі далёка ад радзімы, то практычна ўвесь альбом прасякнуты настальгіяй. Потым вярнуліся дадому, дапрацавалі яго, і атрымалася цэласная карціна. У адрозненне ад папярэдняга альбома, гэты будзе больш гучным, у нечым нават рокавым.

— Якімі прынцыпамі вы кіруецеся ў жыцці і на сцэне?

— Не варта чакаць ідэальных умоў, каб дзейнічаць. Можна доўга разважаць пра планы, шукаць тлумачэнні, чаму нешта можа не атрымацца, але калі пачаць працаваць, то вынік абавязкова будзе. І час, і сілы знойдуцца, каб усё сумяшчаць і не спыняцца. Трэба змяняць сваё жыццё да лепшага, тады і ў творчасці гэта знойдзе сваё адлюстраванне. Але вашу абыякавасць да блізкіх людзей не можа апраўдаць ніякая творчасць.

Алена ДРАПКО.

Страўнік альбо кашалёк?

НАБЫЦЬ КАТЛЕТУ — ЯК ПОДЗВІГ ЗДЗЕЙСНІЦЬ

Колькі ў сярэднім каштуе стандартны абед для студэнта

Знайшоўшы ў старым штодзённіку чэк, ажно здзівілася: за «халасцяцкі» абедзенны набор, які складаўся з пачка пельменяў, упакоўкі смятаны і паўлітроўкі кефіра, у 2010 годзе аддала ўсяго 8 тысяч рублёў. Зараз жа за такую суму далёка не ў кожнай сталоўцы можна падсілкавацца паўнавартасным абедам. Цікава, а колькі ж грошай давядзецца выкласці студэнту, каб добра пад'есці? Адказ пашукала менавіта ў меню ўніверсітэцкіх сталовых...

Фота БЕЛТА.

Які ганарар, такі і абед?

Першая ў спісе — сталовая на Кальварыйскай, 9, якая корміць усіх журфакаўцаў. Яшчэ з першага курса навучання ў Інстытуце журналістыкі стала зразумела: таннага абеду не чакай. Акрамя студэнтаў, у сталовую часта наведваюцца будаўнікі, а таксама офісныя работнікі. Іх заробкі непараўнальна большыя за студэнцкую стыпендыю. Таму, мабыць, і цэны тут вышэйшыя. Чым кормяць? На першае — салянка за 6900 альбо боршчык за 4100 рублёў. Катлетка каштуе 5850, гарнір — бульбяное пюрэ — акурат за 2150. Самы танны салацік з памідораў, капусты і перца «важыць» 2700. Гарбата з пакеціка — 1150. Агулам выйшла роўненька 16 тысяч, і заўважце, гэта яшчэ без салодкага. Сума немаленькая, таму выбіраем спрошчаны, бюджэтны варыянт — смажанку і какаву. Такі пачастунак абышоўся ў 6450 рублёў. Калі ж ёсць жаданне «шыкануць», дык можна замовіць свініну, запечаную з памідорамі, за 18 тысяч рублёў. Эскалоп абыдзецца ў 16 950 рублёў. Карацей, якія ў вас ганарары, спадарства, — так і паабедаеце.

Варыянт другі: насупраць журфакаўскай сталовай знаходзіцца камбінат харчавання «Прамень» з дадаткам у выглядзе кулінарыі з таннымі смажанымі піражкамі (вядома, не лепшы варыянт для здароўя, затое бюджэтны). Якое меню нам прапануюць тут?

На першае — расольнік з мясам кураняці за 4050 рублёў альбо малочны суп за 3250. Пюрэ даражэйшае за «журфакаўскае» ажно на тысячу рублёў — 3150. На другое выбіраем спаржавую фасолю за 5450 і лёгкую салату «вагою» 4450 рублёў. На гэты раз ад мяса адмаўляемся: катлета «Аматарская» каштуе дорага, ажно 12 300. Для гурманаў з тоўстымі кашалькамі ёсць у меню адмыслова запечаная свініна з грыбамі за 23 600. Тушаная свініна каштуе крыху менш — 20 550. Замест гарбаты возьмем кампот — 1450, а на салодкае — «язычок» за 2900. І кавалачак хлеба, таксама не за «дзякуй» — яшчэ 800 рублёў. Неўпрыкмет, рахунак вырас ажно да 19 100 рублёў. Трэба гэтую суму скараціць. «Малочнае», пюрэ, салацік і кампот абышліся ў 12 300 рублёў.

«Языкастым» — хворы страўнік

А што «кладуць на язык» навучэнцы філфака? Як мне расказалі, сталовай на факультэце няма. Студэнты задавальняюць свой апетыт у буфеце. Аднак буфет — гэта не надта добрая альтэрнатыва сталовай. У меню няма гарачых першых страў, а ў якасці другіх прапануюцца толькі варыянты фастфуду: кавалачак піцы — 6000, гамбургер — 13 500, чабурэк — 9000. Гарбаты менш чым за 2500 на філфаку таксама не знойдзеш, затое каву за 8000 рублёў — калі ласка. Безліч шакаладных батончыкаў, печыва, нават марозівам можна пачаставацца. Харчаванне ў рэжыме «сухі паёк і ОК» як бомба запаволенай дзейнасці: выбухне пасля хранічным гастрытам. Прыгадаліся аўтаматы з ежаю, якія на журфаку неаднойчы прыходзілі на дапамогу падчас позніх вячэрніх заняткаў. Праўда, бутэрброды, салодкае ў розных варыяцыях — наўрад ці можна назваць здаровым харчаваннем. Гарачы «булёнчык» знайшоўся ў аўтамаце з напоямі па адным кошце з гарбатаю — 3000 рублёў. Падымаюся на паверх вышэй — і вось на табе, дванаццатая гадзіна дня, а аўтаматы з ежаю пустыя!..

А ў «тэхнікаў» — парадак!

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі справа з харчаваннем студэнтаў наладжана добра. Тутэйшая сталовая — адна з самых танных у горадзе. Праверым! Бяром суп бульбяны з фасоллю за 2750 рублёў (з капусты каштуе ўсяго 1900), тушаную капусту за 1600, адшкадуем на катлету 6350 і 2150 — на салат з агуркоў і памідораў. Кавалачак хлеба — 650 рублёў. І гарбата за 450 — праўда, непакецiраваная. Агулам выйшла 13 950 рублёў — і гэта без дэсерту. Дарэчы, здараецца і такое: у меню замоўлена і пюрэ, і капуста, і катлета, а на раздачы прапануюць пшонку ды біточкі. Завядзёнка гэтая назіраецца звычайна ў вялікіх сталовых: чэргі тут велічэзныя, таму пюрэ дастаецца самым галодным. Дарэчы, тут мой рахунак не перавысіў

У меню няма гарачых першых страў, а ў якасці другіх прапануюцца толькі варыянты фастфуду: кавалачак піцы — 6000, гамбургер — 13 500, чабурэк — 9000.

7500, але гэта без мяснога дадатку. Расольнік ленінградскі, пшонка, вінегрэт, смятаннік, кампот і кавалачак хлеба — дастаткова, каб наесціся. «Палтаўская» катлета павысіла б мой рахунак на 12 700, але была ў наяўнасці яго «бюджэтная замена» — смажаны мінтай за 5500. Недарма ўсё ж такі сталовыя тэхнічных ВНУ карыстаюцца папулярнасцю — цэны тут адэкватныя.

Парады эканомным

Як бачым, у пытаннях арганізацыі харчавання студэнтаў «фізікі» перамаглі «лірыкаў». Аднак, нават нягледзячы на бюджэтныя абеды, заўжды ёсць студэнты, якіх не задавальняе якасць прыгатаванай ежы. Гэта могуць быць і гурманы, і вегетарыянцы, і людзі на спецыяльнай дыеце. У такой сітуацыі паратунак таксама ёсць: можна гатаваць ежу дома, падчас перапынкаў у мікрахвалёўцы яе разаграваць. Тое ж з гарбатай альбо кавай: можна прыносіць уласную, а ў сталовай браць толькі кіпень, альбо карыстацца тэрмасам. «Сухі паёк» лепш за ўсё загадзя набываць у краме — звычайна выходзіць танней. Асабліва гэтая парада актуальная для тых, чые кашалькі на «дыеце». Ведаю па сваім вопыце: у сталовай паўнавартасны абед брала ўсяго некалькі разоў. З дзяўчатамі заўжды абавязкова набывалі суп — каб парадаваць страўнік. А набыць катлету для студэнта — як подзвіг здзейсніць! Звычайна даводзіцца сёння браць адно, а заўтра — другое. Галоўнае — не застацца галодным.

Кацярына РАДЗЮК, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ.

Вялікі перапынак

«ПАДКАРМІЦЬ» ІНТАРЭС ДА ВУЧОБЫ

Пры ўстановах адукацыі краіны, паводле звестак Міністэрства гандлю, працуюць амаль 4,4 тысячы аб'ектаў грамадскага харчавання на больш чым 390,3 тысячы месцаў. Да пачатку гэтага навучальнага года былі ўведзены чатыры новыя аб'екты на 690 месцаў, у тым ліку два пры школах у Мінску і адзін у Гродзенскай вобласці, а таксама адзін пры ВНУ — у Віцебскай.

Аб'екты грамадскага харчавання разам з педагагічнымі калектывамі ўкараняюць арганізацыю харчавання па прынцыпе «шведскага стала», вядуць дастаўку скамплектаваных рацыёнаў харчавання ў індывідуальнай упакоўцы, прыём заказаў на стравы па меню заўтрашняга дня. Шырокае распаўсюджванне атрымала папярэдняе накрыццё сталоў і падача салатаў, першых страў, напояў у шматпарцыённым посудзе — каб навучэнцы потым самі або з дапамогай дзяжурных настаўнікаў і старшакласнікаў маглі накласці асобную порцыю.

У цэлым па краіне па сістэме папярэдніх замоў страў заўтрашняга дня сёння працуюць больш за палову школьных сталовых, ахоп гарачым харчаваннем у іх складае 85-100 працэнтаў. Харчаванне навучэнскай моладзі адбываецца за кошт бюджэтных сродкаў і бацькоўскай аплаты. За кошт бюджэтных сродкаў (цалкам або часткова) забяспечваецца больш за палову навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў.

Дзякуючы падтрымцы арганізацыі харчавання на дзяржаўным узроўні атрымліваецца забяспечыць яго даступнасць у школьных, студэнцкіх сталовых краіны і ахоп харчаваннем навучэнскай моладзі ў агульнаадукацыйных установах на ўзроўні 77-95 працэнтаў, студэнтаў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых устаноў — ад 40 да 75 працэнтаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК ТРАЯН СТАЎ ВІРУСАМ...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Таксама адной з прычын я лічу шаблоннае, стэрэатыпнае засваенне ведаў. Калі студэнт кажа, што «Янка Купала напісаў «Новую зямлю», а Якуб Колас — «Бандароўну», гэта значыць, што ў школе гэтых аўтараў ён успрымаў як амаль аднолькавых, як братоў-блізнят. Так яго навучылі настаўнікі. А трэба было паказваць не толькі падабенствы, але і адрозненні паміж гэтымі пісьменнікамі. Тым больш што адрозненняў паміж імі вельмі многа.

Існуюць таксама і ўласна філаніэмы. Калі студэнт кажа пра тое, чаго ніколі не чуў, спрабуючы выкруціцца са складанай сітуацыі: «Васіль Цяпінскі — гэта быў чалавек, у нечым падобны да Міколы Гусоўскага». Мае месца абытаўленне літаратурных рэалій: «Кірыла Тураўскі напісаў малітваў трыццаць штук» і г.д. Вялікі ўплыў аказвае масавая культура: мыльныя оперы, серыялы. Да прыкладаў можна аднесці выказванне пра тое, што «Рагнеда не захацела пайсці замуж за нейкага там князя і ў знак пратэсту саскочыла са сцяны крэпасці».

— Вы выкладаеце беларускую літаратуру ў МДЛУ і на журфаку БДУ. Якія студэнты памыляюцца больш?

— Я пачаў бы з таго, што памылкі ў адказах — гэта нават не заўжды дрэнна. Часам студэнты могуць здзівіць не толькі сваёй памылкай, але і нечаканай празарлівасцю. Напрыклад, вельмі часта яны арыгінальна адказваюць на такія пытанні, над якімі я сам не задумваўся. Прывяду такі прыклад: аднойчы я задаў студэнтам сваё традыцыйнае пытанне паводле паэмы «Магіла льва» Янкі Купалы: «Чаму народ, памятаючы крывавыя «подзвігі» Машэкі, усё ж узводзіць у яго гонар такі вялікі вал, быццам бы няма іншых людзей, якія заслужылі такой памяці?» І адзін студэнт сказаў: «Гэта людзі зрабілі для таго, каб ён ніколі не падняўся».

А што датычыць канкрэтна пытання, то я не бачу ніякіх адрозненняў у колькасці памылак паміж студэнтамі розных ВНУ. Можна толькі заўважыць, што характар гэтых памылак адрозніваецца.

— Як вы думаеце, кожнае новае пакаленне студэнтаў дазваляе сабе ўсё больш памыляцца?

— Студэнты — аднолькавыя: што раней, што зараз. Справа зноў-такі ў характары. Стала больш камп'ютарных агаворак. Я пытаюся, хто такі Траян (быў такі персанаж у «Слове аб палку Ігаравым»), а студэнт адказвае, што гэта вірус. Вось і ўсе змены.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

СТУДЭНЦКІЯ АГАВОРКІ:

Філанізмы

❍ Адам Міцкевіч нарадзіўся ў 1798 годзе, а памёр... Ну, словам, гэта здарылася **напрыканцы яго жыцця.**

❍ Я ведаю двух беларускіх пісьменнікаў, адзін з якіх меў псеўданім Дунін, а другі Марцінкевіч. Толькі я не ведаю, хто з іх быў Купала, а хто Колас.

Эфект сапсаванага тэлефона

❍ Паэтычная мянушка Уладзіслава Сыракомлі была «**Пернік** вясковы» (насамрэч мянушка Сыракомлі была «Лірнік вясковы»).

❍ Кандрат Крапіва напісаў бліскучую байку **«Дзе ты, баба?»** (мелася на ўвазе байка пад назвай «Дзед і Баба»).

❍ Кандрат Крапіва напісаў шмат баек. Адна з іх называецца «Дыпламаваны **банан**» (знакамітая байка Крапівы называлася «Дыпламаваны баран»).

Агаворкі паводле Фрэйда

❍ Паэмы Янкі Купалы пад назвамі «**Яна і ён», «Я і яна», «Ён і яна», «Яна і Ян», «Ян і Яніна», «Яна і Яна»** (паэма Купалы мае назву «Яна і я»).

❍ Сучаснікам Скарыны быў еўрапейскі мысліцель **Аргазм** Ратэрдамскі (насамрэч Эразм Ратэрдамскі).

❍ Чаму Ганна пайшла замуж не за Васіля Дзятла, а за Яўхіма? Ну, ён жа яе злавіў у кустах і падраў на ёй сукенку.

Змешванне рэалій

❍ Мікола Гусоўскі напісаў «Песню пра зубра», а Францыск Скарына — музыку да гэтай песні.

❍ «**Іван Мележ** гаварыў прамову ў сойме, у якой усхваляў караля Жыгімонта» (меўся на ўвазе Іван Мялешка).

Абытаўленне рэалій

❍ Мікола Гусоўскі паглядзеў у Рыме бой быкоў, і тут яму ў галаву прыйшла **мысля** напісаць «Песню пра зубра».

❍ Уладзіслаў Сыракомля рана страціў каханую і таму пачаў **прыкладацца да бутэлькі.**

❍ Тарасу багі не спадабаліся, таму што яны **вялі распусны лад жыцця.** Зеўс ляжаў на пячы, а Амур ціскаў дзевак.

❍ Самсон Самасуй і ягоныя сябры **ўсім кагалам** сачынілі п'есу, а потым яе паставілі.

Мадэрнізацыя

❍ Францыск Скарына ездзіў у Вітэнберг і там сустракаўся з **Марцінам Лютэрам** Кінгам.

❍ У XIX стагоддзі былі напісаны парадыйныя паэмы. Напрыклад, «Энэіда **на выбарах»** (замест «Энэіда навыварат»).

❍ Гервасій Выліваха і яго сябры любілі набраць гарэлкі, **паехаць на прыроду** і зрабіць там **шашлыкі**.

Наіўная інтэрпрэтацыя

❍ Дзеянне паэмы Я. Купалы «На куццю» адбываецца на замчышчы. Замчышча — гэта аграмадны замак.

❍ Крытыку ўстрывожыў цыкл вершаў Язэпа Пушчы «Лісты да сабакі», таму што ніхто не ведаў, існуе на самой справе сабака ці не.

❍ У творы Янкі Брыля праводзіцца глыбокая думка, што птушак цягне да свайго гнязда, а людзей — да сваіх дамоў. Адсюль можна зрабіць вывад, што людзі — не птушкі.

❍ Мацей разумны. Ён толькі строіць з сябе **Бурачка**.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
26 09 2013 г.

Адпачынак з чыстым сумленнем

НІМФА АДРЫЯТЫЧНАГА МОРА, або Чаму чарнагорцы не любяць працаваць

Дзяўчына дзень і ноч чакае свайго каханага.

Холад, які ўварваўся ў нашу краіну з надыходам восені, прымусіў успомніць амаль саракаградусную спёку на Адрыятычным узбярэжжы гэтым летам. Адразу захацелася вярнуцца ў цудоўную Чарнагорыю, дзе высокія, дужыя, смелыя мужчыны нічога не робяць, а дзяўчаты так любяць загараць, што ажно камянеюць на пляжы.

«СВАЕ ГОРЫ МЫ НЕ АДДАДЗІМ»

Думаю, каб пазнаць чарнагорца, не трэба прасіць паказаць пашпарт. Тым больш што яго, напэўна, не будзе. Не, выключна намінальна, для парадку, ён можа дзе-небудзь ляжаць. Але ім ніхто не карыстаецца. Пра дакументы і ў замежнікаў ніхто не пытаецца. Калі праходзілі сербска-чарнагорскую мяжу (а было тое ўначы), нас нават не пабудзілі — як ехалі, так і паехалі далей. Во дзе гасціннасць! Таму пашпарты ў Чарнагорыі не патрэбныя. Там замест пашпарта — запаветы. Іх усяго дзесяць (гл. вынаску). Нядрэнна, ці не так? Дык вось, каб камфортна адпачываць у горнай краіне, абавязкова трэба ведаць гэтыя запаветы. Іначай вы проста не будзеце разумець, што навокал адбываецца: чаму ніхто нікуды не спяшаецца, чаму можна чакаць засялення ў гасцініцу па 6 гадзін, чаму квіток на цягнік не можа гарантаваць таго, што ў вас будзе месца ў вагоне, і гэтак далей.

Адзін гід раскрыў нам, замежнікам, сакрэт паспяховасці і ўсеагульнага выканання нацыянальных запаветаў. «Паглядзіце вакол сябе, — сказаў ён. — Што вы бачыце? Горы. І так па ўсёй краіне. Няма зямлі, толькі горы. І мы іх нікому не аддадзім, бо пад гарамі — зямля. А яе трэба будзе апрацоўваць. Не, мы лепш будзем турызмам займацца». І займаюцца. І даволі паспяхова. Але не будзем ім замінаць у гэтай справе, паколькі, як вы памятаеце, калі бачыш, што хтосьці працуе, — бяжы ад яго.

СТАГАДОВАЯ ВАЙНА З... ЯПОНІЯЙ

Як бы я ні ставіўся да чарнагорцаў, колькі б я іх не называў лянівымі, усё роўна яны — вельмі мужныя. Вы толькі падумайце: ваявалі з Японіяй (не самай слабай у вайсковай справе краінай) цягам 102 гадоў. Вы скажаце: «Ніколі не чуў пра яшчэ адну «стагадовую вайну», і тым больш паміж гэтымі краінамі». І будзеце мець рацыю, бо ніякай вайны не было. Не, чарнагорцы сумленна складалі галовы падчас руска-японскай вайны (1904-1905 гадоў), служачы ў расійскім войску, а вось баявых дзеянняў непасрэдна паміж «горцамі» і «самураямі» ніколі не вялося.

Справа ў тым, што адбыўся дыпламатычны казус. У 1904 годзе маленькая (сёння крыху больш за 600 тысяч насельніцтва), але гордая краіна Чарнагорыя, каб падтрымаць Расію, аб'явіла вайну Японіі. А вось калі падпісвалася мірнае пагадненне паміж Расіяй і Японіяй, пра невялічкую краіну забыліся. У выніку мірнае пагадненне паміж Чарнагорыяй і Японіяй было падпісана толькі праз 102 гады — у 2006-м. Дарэчы, у тым жа годзе Чарнагорыя стала незалежнай, аддзяліўшыся ад Сербіі. Частка чарнагорцаў дагэтуль лічыць сябе сербамі.

«ЦЯЖКАЯ» ПРАФЕСІЯ АФІЦЫЯНТА

Мне будзе складана гэта прызнаць, аднак менавіта чарнагорцы не толькі мужныя ваяры, але і сапраўдныя джэнтльмены. Чаму я так вырашыў? Ды таму, што я ніколі не сустрэў у кавярні ці рэстаране ніводнай жанчыны-афіцыянткі. Самі чарнагорцы тлумачаць гэта тым, што праца афіцыянта вельмі цяжкая, а значыць, жанчыны ёю займацца не павінны. Вучыцеся!

Адзінае толькі, што пры гэтым чамусьці жанчыны актыўна працуюць прадаўцамі, турыстычнымі агентамі, прыбіральшчыцамі, поварамі і гэтак далей. А мужчыны ў гэты час сядзяць у мясцовай кавярні і п'юць або каву, або піва (дарэчы, піўзавод — ледзь не адзінае паспяхова працуючае прадпрыемства ў краіне), або яшчэ які напой — усё ж такі на вуліцы вельмі спякотна. Сваімі вачыма бачыў кожны дзень гэту карціну побач з гасцініцай: з самай раніцы гатуюць жанчыны смачную піцу і іншы фастфуд у найбліжэйшай «забягалаўцы», а на рагу вуліцы стаяць машыны таксі, кіроўцы якіх у суседняй установе штосьці папіваюць. Мне чамусьці заўсёды здавалася, што таксісты шмат працуюць. Але ўсё, напэўна, залежыць ад іх месцазнаходжання...

10 запаветаў чарнагорца:

1. Чалавек нараджаецца стомленым і жыве для таго, каб адпачываць.

2. Любі свой ложак, як самога сябе.

3. Адпачывай удзень, каб спаць уначы.

4. Не працуй — праца забівае.

5. Калі ўбачыш каго-небудзь, хто адпачывае, дапамажы яму.

6. Рабі менш, чым можаш, а тое, што можаш, — даручы іншаму.

7. Ад адпачынку яшчэ ніхто не памёр.

8. Праца прыносіць хваробы — не памры маладым.

9. Калі захочаш працаваць, прысядзь, адпачні. Убачыш — гэта пройдзе.

10. Калі бачыш, што хтосьці есць і п'е — далучайся да яго; калі бачыш, што хтосьці працуе, — бяжы ад яго.

РАКІЯ. CONNECTING PEOPLE

Так перафразаваў вядомы ва ўсім свеце слоган кампаніі Nokia той самы гід, які распавёў пра запаветы. Ракія — гэта вельмі моцны алкагольны напой, які атрымліваюць шляхам браджэння рознай садавіны і ягад. Такі мясцовы, балканскі самагон. У Чарнагорыі найбольшай папулярнасцю карыстаецца слівовіца, якую, зразумела, робяць са сліў. Але могуць выкарыстоўваць вінаград, абрыкосы, персікі, яблыкі, грушы, чарэшні, інжыр, ажыны і шмат іншага. Мацунак гэтага напою можа даходзіць да 50-60 градусаў, а бывае і больш. Гатуюць ракію амаль у кожнай хаце. Не, не для продажу. Для сябе. Ці для гасцей, якіх там насамрэч любяць і паважаюць.

Пра ракію ёсць нават выдатны анекдот. Вырашылі высветліць, чый «саматужны» напой мацнейшы. Паклікалі англічаніна, рускага і чарнагорца. Сказалі кожнаму выпіць па літры свайго нацыянальнага напою. Выпіў англічанін віскі — яго запрашаюць у пакой, дзе стаяць два крэслы, і пытаюцца: «Колькі бачыш крэслаў?» Ён адказвае — «Восем». Тое самае робяць з рускім пасля літру самагону. Ён адказвае: «Шаснаццаць». Апошнім ідзе чарнагорац пасля порцыі ракіі. Пытаюцца: «Колькі крэслаў?». Адказвае: «А ў якім радзе?». Таму будзьце асцярожнымі з ракіяй, калі вам давядзецца яе пакаштаваць.

«ТАНЦОРКА З БУДВЫ»

Гэта паўнавартасны сімвал Будвы, самага буйнога горада на ўзбярэжжы. Сапраўдны турыст абавязкова павінен наведаць пляж Могрэн, дзе сустрэнецца з ёю. З дзяўчынай, якая згубіла купальнік. А дакладней, з яе статуяй.

Насамрэч, помнік называюць «Танцорка з Будвы» ці «Балярына». Стаіць ён пасярод скал. Але пры жаданні да помніка можна дабрацца. Што многія і робяць. Асабліва тыя, хто прытрымліваецца «сексуальнай» версіі паходжання статуі.

Ёсць жа і іншыя гіпотэзы. Напрыклад, адна легенда кажа, што аднойчы на маладых людзей, якія тут купаліся, напала нейкае марское страшыдла. Хлопец загінуў, а дзяўчына паспела выплыць. І з той пары яна кожны вечар прыходзіла на бераг і глядзела ўдалячынь, быццам чакаючы, што каханы ўсё ж вернецца.

Рэальная ж падстава для стварэння прыгожай скульптуры была іншая. Мастак Градзімір Алексіч быў натхнёны на працу легендай аб дзяўчыне, у якой быў жаніх — матрос. Ён паплыў далёка ў мора, а тая кожную раніцу прыходзіла на гэтую скалу і, гледзячы ў адкрытае мора, чакала вяртання свайго жаніха. Яна праводзіла цэлыя дні, месяцы і гады ў гэтым чаканні, але карабель з каханым так і не вярнуўся. Таму статуя стала сімвалам вернага кахання і адданасці. І кожны сам сёння вырашае, як яму ўспрымаць бронзавую дзяўчыну.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.
Мінск-Будва-Мінск

«Пенны тур»

ДЗЕ ПІРАВАЦЬ — ТАМ І ПІВА РАЗЛІВАЦЬ

«Няма такога паскудства на душы, якое нельга змыць некалькімі куфлямі піва», — напэўна, гэта адно з самых папулярных выказванняў брытанскага пісьменніка Ірвіна Уэлша, якое па справе і без яе цытуюць тысячы інтэрнэт-карыстальнікаў. Але, што ні кажы, страляе словам брытанец «у яблычка». Півам змываюць хандру, запіваюць здраду каханак, з ім глядзяць хакей і ляскаюць куфлем аб куфель за здароўе і проста так. Пад піва вядуць вучоныя размовы пра вывучэнне механізму электраслабай сіметрыі, чытаюць газеты, спяваюць песні і да скону клянуцца ў сяброўскай вернасці. Гэты пенны напой не толькі аб'яднаў вакол сябе прадстаўнікоў розных прафесій, але і стварыў асаблівую культуру спажывання. Карэспандэнт «Чырвонкі» наведаў Прагу і падгледзеў, як і дзе п'юць галоўны чэшскі ячменны напой.

Тут рэм правіў Гашэк!

Жыжкаў. Яшчэ стагоддзе таму гэты пражскі раён з цеснымі, гарбатымі вулачкамі быў асобным горадам, але з часам яго прымусілі аб'яднацца з вялікай Прагай. Тут ніколі не сяліліся арыстакраты. Маленькія, але ўтульныя кватэры з невысокімі столямі насялялі простыя рабочыя, рамеснікі. Жыжкавякі маглі добра папрацаваць, а пасля не менш выдатна адпачыць. Ды так, што пад піва, віно ці абсент у піўных гула ад смеху ўся вуліца. Сваіх герояў у кожным шынку хапала. А вось у піўной «У Каменача» рэй вёў сам Яраслаў Гашэк. Менавіта там, пасля некалькіх куфляў, ствараліся неўміручыя «Прыгоды бравага салдата Швейка», якімі ўжо здавён зачытваецца ўся Еўропа. Таму і не дзіўна, што менавіта ў гэтым раёне ўстанавілі адзіны на ўсю Чэхію помнік непараўнальнаму сатырыку.

Мінула стагоддзе, аднак «кабацкасць» Жыжкава не знікла з пражскай рэчаіснасці, а, наадварот, стала больш відавочнай. Гэты раён турысты нават называюць піўной сталіцай Чэхіі, краіны з найбольшай у свеце колькасцю спажывання піва на душу насельніцтва. Што казаць, піва тут самы паважаны напой, які гатуюць больш чым у 140 піваварнях. А таму здагадацца, дзе на нашай планеце з'явіўся першы выцвярэзнік, мяркую, таксама не цяжка. У 1951 годзе пражская клініка «Апалінарж» адчыніла дзверы для тых «шчасліўчыкаў», хто патапіў сваю цвярозасць у куфлі любімага піва. Цікава, што менавіта гэтая бальніца колькі гадоў таму пачала біць у набат пад далёка не самым арыгінальным для нашага часу месэджам: «700 тысяч жыхароў Чэхіі пакутуюць на алкагольную залежнасць!». І вы думаеце, гэта падзейнічала? Наадварот, чэхі як хадзілі з сябрамі «ў піва», так і ходзяць. Тым больш, калі цэны на бутэлькі з напоем толькі спрыяюць падобным праменадам. За 25 крон (а гэта ўсяго толькі 1 еўра) у звычайнай пражскай краме можна набыць дзве бутэлькі якаснага чэшскага піва. Аднак пакінем падлікі камерсантам, а самі паглядзім, як чэхі адпачываюць за куфалем пеннага напою.

У адрозненне ад беларусаў, піць піва на вуліцы чэхам дазволена. І за мае паўтара тыдня пражскіх канікул мне даводзілася бачыць піванаў паўсюль. І ў звычайных палатках, якіх шмат і ў нашым Мінску, і на Карлавым мосце, і на беразе бурлівай, часам небяспечнай Влтавы, і нават на прыступках вялікага касцёла падлеткі не толькі скакалі на дошцы, але і смакавалі баначнае піва. І ніякіх заўваг. Маўляў, хлопцы, вы ж толькі не хуліганьце! Аднак вулічнае пітво ў сапраўдных аматараў не каціруецца. У кожнага чэшскага мужчыны ёсць улюбёная піўная — таямнічая «кватэра для спаткання», дзе кожны ведае яго імя, дзе кожны адкажа яму старым добрым чэшскім жартам! Для пастаянных кліентаў афіцыянты трымаюць нават імянныя куфлі, куды наліваюць улюбёнае піва паважаных чэшскіх спадароў.

У кожнага чэшскага мужчыны ёсць улюбёная піўная — яго таямнічая «кватэра для спаткання», дзе кожны ведае яго імя, дзе кожны адкажа яму старым добрым чэшскім жартам!

Дадатак да добрай размовы

Чым бліжэй цэнтр Прагі, тым вышэйшыя цэны ў меню. Натоўпы галодных турыстаў на Старамесцкай плошчы гатовы злізаць усё да апошняй крошкі, а таму доўга не задумваюцца наконт таго, колькі будзе каштаваць вячэра. Знайсці там сапраўднае піўное месца, дзе адпачывалі б толькі чэхі, складана. І калі дажджлівым вечарам я зайшоў у піўную пад назвай «У вадзянога павука», быў здзіўлены, бо ніякіх іншаземцаў, акрамя нашай кампаніі, там не было. Драўляныя сталы, на паліцах у розных кутках — піўныя прылады, а са старых шэрых здымкаў на наведвальнікаў пазіраюць вусатыя чэшскія півавары... Каля бармена — дзясятак кранікаў, па якіх вандруюць струмені цёмнага, светлага і нефільтраванага піва. Ты толькі скажы — і перад табой ужо будзе стаяць на каляровай кардоннай падстаўцы куфель з чаканым напоем. Пакінуць пустымі пасля сябе 5 піўных келіхаў — гэта для чэхаў тое ж, што пералічыць усе значныя перамогі сваёй хакейнай зборнай. Аднак у сваіх піўных яны не выглядаюць «алкаволатамі». Для іх піва — дадатак да добрай размовы, якая льецца ледзь не да паўночы. Цікава, што і закускі многім з іх для гэтага не патрэбныя. А калі ўжо зусім засмокча, імчыць да іх афіцыянтка з марынаваным сырам ці «мясной дошчачкай» з беконам і вяндлінай. Толькі гэта проста лёгкі дадатак да піва і не больш. Праўда, калі захочаш добра пад'есці, будзь гатовы адчуць на сабе ўвесь смак чэшскай кухні. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, зусім іншая падстава для размовы.

P.S. Калі Радка Пытлік, біёграф Яраслава Гашэка, вырашыў абысці ўсе піўныя, дзе калісьці адпачываў яго вядомы герой, ён спыніўся на лічбе 145. У спадара Пытліка забалела печань... А таму яшчэ раз паўтараем: празмернае ўжыванне піва можа негатыўна ўплываць на стан вашага здароўя.

Тарас ШЧЫРЫ.

ООО «Арбитр», управляющий по делу о банкротстве – организатор торгов, СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ по продаже имущества частного предприятия «Наш Край»:

№ лота	Наименование лота	Начальная цена продажи лота	Шаг торгов (5%)	Задаток (5%)
1	**Площадка рынка «Наш Край», инв. № 450/С-25002 (сооружение неустановленного назначения) (в состав сооружения входят: покрытие, бордюр тротуарный, бордюр дорожный, газонное покрытие, автомобильная парковка и т.д.)**	834 065 100 р.	41 703 255 р.	41 703 255 р.

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

Торги состоятся 15 октября 2013 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5.

До подачи заявки Претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: р/с 3012036435941 в ЦБУ № 422 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Слоним, код 152101689, МФО 153001369, УНП 590093379.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копии паспорта, принимаются с момента выхода настоящего объявления **до 14.00 14.10.2013** по адресу: 230001, г. Гродно-1, а/я 27 или по факсу 8(0152) 526859.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов с победителем подписывается протокол и заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

В соответствии с п. 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Настоящее объявление содержит лишь общие характеристики предмета торгов. Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Гродно, ул. Солнечная, 5, тел. 8(029)7831160, тел./факс 8(0152)526859. Ознакомиться с предметом торгов (площадкой рынка) можно в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Гродненская область, г. Слоним, ул. Тополевая, д. 22.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже земельных участков в частную собственность граждан в Ушачском районе Витебской области

Организатор: Веркудский сельский исполнительный комитет

Лот	Местоположение земельного участка, площадь, кадастровый номер	Условия и ограничения, инженерно-геологические условия*	Сумма подлежащих возмещению затрат на формирование и регистрацию участка, руб.	Начальная цена лота, рублей
1	д. Горы 1, д. 6, Ушачского р-на Витебской обл. площ. 0,2282 га кадастровый № 224980902601000013	земли в водоохранных зонах водных абъектов оз. Черствядское	4 758 980 Кроме того, плюс расходы на организацию и проведение аукциона	5 000 000 Задаток 10% 500 000

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры, возможность подключения к инженерным сетям.*

Целевое назначение участка — для строительства и обслуживания жилого дома, назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества 1 09 02 — земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома).

1. **Аукцион состоится 28 октября 2013 года в 12.00 в здании Веркудского сельского исполнительного комитета по адресу: 211493, аг. Веркуды, ул. Школьная, д. 13 Ушачского р-на Витебской обл., 2-й этаж. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений и документов 25.10.2013 г. до 17.00.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

3. Сумма задатка перечисляется на р/с № 3641328021084, ф-л № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНН 300007073, код платежа 04901, получатель — Веркудский сельисполком.

Контактные номера тел.: **802158 25424, 802158 25447.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В СОБСТВЕННОСТЬ В г. ГРОДНО

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	Земельный участок У-328*	м-н «Заболоть»	0,0943	440100000002007412	2 674 617	54 832 810	6 000 000
2	Земельный участок У-329*	м-н «Заболоть»	0,0951	440100000002007413	2 674 617	55 297 987	6 000 000
3	Земельный участок У-336*	м-н «Заболоть»	0,0976	440100000002007407	2 674 616	56 751 667	6 000 000
4	Земельный участок У-337*	м-н «Заболоть»	0,0975	440100000002007408	2 674 616	56 693 520	6 000 000
5	Земельный участок У-65*	м-н «Зарица-5»	0,0910	440100000003004769		52 983 500	6 000 000
6	Земельный участок У-86*	м-н «Зарица-5»	0,1193	440100000003004725		69 460 800	6 000 000
7	Земельный участок У-144*	м-н «Зарица-5»	0,0892	440100000003005100		51 935 500	6 000 000
8	Земельный участок У-253*	м-н «Зарица-5»	0,0908	440100000003004916		52 867 000	6 000 000
9	Земельный участок У-304*	м-н «Зарица-5»	0,0893	440100000003004791		51 993 700	6 000 000

**Инженерные коммуникации на участках отсутствуют. Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности для строительства и обслуживания индивидуального жилого дома.*

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 30 октября 2013 г. в 15.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) не позднее **25 октября 2013 г.** в размере, указанном в графе 8 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3012000041810 в филиале № 400 «Гродненском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 590727594, получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в ГП «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 61 с 30 сентября 2013 г. по 25 октября 2013 г. включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан;

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись;

возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (152) 72 05 46, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Червенского райпо (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже

здания магазина № 63,

инвентарный номер 615/С-15650, об. пл. 538,5 кв.м, расположенного по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г.п. Смиловичи, ул. М. Горького, д. 1.

Начальная цена с НДС – 1 080 115 200 бел. руб.

Площадь земельного участка – 0,1296 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

Задаток 10 % от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.09.2013.

Аукцион состоится **08.10.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703, пом. 5. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.10.2013** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

Извещение о проведении 28 октября 2013 года торгов с условиями по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)		Инв. № бух.
	Производственное помещение с инвентарным номером 500/D-708047818 общей площадью 2783,3 кв.м	
	ВРУ (вводно-распределительное устройство) ИН1 УХЛ-4 380/220В 50 Hz 630А	5123
	ВРУ (вводно-распределительное устройство) ИН1 УХЛ-4 380/220В 50 Hz 630А	5124
	Пункт распределения ПР	0520
	Пункт распределения ПР	0521
	Пункт распределения ПР	0522
	Пункт распределения ПР	0523
	Пункт распределения ПР	0524
	Трансформатор ТЖ-630/10	0525
	Трансформатор ТЖ-630/10	0526
	Шкаф ШРФ 1-25	138124
	Шкаф ШРФ 1-24	138125
	Шкаф ШРФ 1-24	138128
	Бойлер «Аристон»	5401
	Бойлер «Аристон»	5402
Местонахождение продаваемого имущества	г. Минск, ул. Селицкого, 113А/1-3	
Сведения о продавце	ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, 8, 220099, г. Минск, телефон (017) 212-50-62	
Сведения об организаторе торгов	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск	
Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС)	19 942 130 400 белорусских рублей	
Сумма задатка	1 000 000 000 белорусских рублей	
Наличие обременений	аренда	
Условия аукциона	1. Победитель торгов (покупатель) обязуется заключить договор на электроснабжение с РУП «Минскэнерго» филиал «Энергосбыт», расположенный по адресу: 220013, г. Минск, ул. Богдана Хмельницкого, 6, и заключить договора на снабжение электроэнергией с субабонентами и организациями-балансодержателями имущества, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Селицкого, 113, 115, получающими электроэнергию от трансформаторной подстанции, находящейся в продаваемом производственном помещении. 2. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 0,8 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 календарных дней со дня проведения торгов.	

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **28 октября 2013 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 26.09.2013 по 23.10.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017) 212 50 62 (ОАО «Автомагистраль»).

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
26 09 2013 г.

SEX=БАЛЯСЫ

ПАМІЖ НАМІ, ХЛОПЧЫКАМІ...

Каму на свеце жыць добра? Дакладней, каму жывецца лепш — мужчыну ці жанчыне? Дзіўнае, на першы погляд, пытанне, праўда? І я спачатку так падумаў, калі выпадкова ў сеціве натрапіў на... Не, на гэты раз не на даследаванні навукоўцаў, якія вельмі моцна паважаю, а на адмысловы «народны» рэйтынг пераваг моцнай паловы перад прыгожай. А потым падумаў: нешта ў гэтым усё ж ёсць. Усур'ёз успрымаць тэму, вядома, не варта, але, пагадзіцеся, кожны з нас — і мужчыны, і жанчыны — у пэўных жыццёвых сітуацыях не-не ды і падумае ці нават скажа ўголас: а ўсё ж такі добра, што я — не яна (ці не ён)...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У вышэйназваным «рэйтынгу» амаль два тузіны прычын, чаму мужчынам быць лепш, чым жанчынай. Але, думаю, канкрэтная лічба не мае значэння, бо пры жаданні кожны з нас можа або дадаць яшчэ колькі такіх прычын ад сябе, або, наадварот, скараціць гэты пералік. Таму пройдземся толькі па асобных.

Першая прычына, чаму мужчыну жывецца лепш, чым жанчыне: яму не трэба выбіраць абцасы ці платформу, каб выглядаць прывабна. 1:0 на карысць мужчын. Як у тым анекдоце: ніводная жанчына не выбірае сабе сужэнца па прыгажосці ног. Хаця, ведаеце, гэты «козыр» хутка могуць выбіць з рук (ног) мужчын: на Захадзе з'явіліся дзівакі, якія носяць туфлі на вялікіх абцасах... Далей. У мужчын не бывае ПМС, калі свет падаецца злосным і жудасным. Ды і крызіс сярэдняга ўзросту, калі многія мяняюць працу на больш цікавую, а жонак, што надакучылі, на больш юных, пераносіцца мужчынамі напаўна, прасцей. Жорстка, але жыццёва. Рэдка бывае, калі дзяўчына «бальзакаўскага ўзросту» заводзіць сабе маладзейшага сужэнца. Звычайна ўсё наадварот. (Памятаеце анекдот з нагоды? Аб'ява ў газеце: «Мяняю 40-гадовую жонку на двух 20-гадовых дзяўчат. Варыянт «4 па 10» не прапаноўваць».) На крайні выпадак, каб аблегчыць крызіс сярэдняга ўзросту, можна купіць новую машыну. Калі на яе няма грошай, змяніць стыль у адзенні на больш моладзевы. Ці вуха «прабіць». Па начных клубах пачаць бадзяцца.

Нараджаць у пакутах мужчынам таксама не трэба. Напісаў вось і задумаўся... Тут сітуацыя, як з вышэйзгаданымі абцасамі: ужо вядомы выпадак, калі колішні мужчына нарадзіў... Куды коціцца свет?.. Мужчыны, трымаемся! І рушым далей па спісе. Да бландзіна за рулём не ставяцца насцярожана, як да жанчыны з тым жа колерам валасоў. («І куды гэта мы так спяшаемся па сустрэчнай?» — «Не ведаю, але мабыць ужо не паспела: усе едуць у зваротным напрамку».)

Мужчына не камплексуе, калі на якой вечарынцы бачыць іншага мужчыну, апранутага гэтак жа, як і ён. Гэты факт аўтаматычна лічыцца чарговым тостам — за знаёмства.

Паход у цырульню не з'яўляецца для мужчыны важнай падзеяй, а ад'езд любімага майстра — катастрофай планетарнага маштабу. Ну, не атрымалася пастрыгчыся, значыць, будзем насіць доўгія валасы, зменім імідж крыху. А тыднёвае шчацінне заўсёды можна патлумачыць чарговай спробай адпусціць бараду. Ды і дэпіляцыя мужчынам не пагражае. А насамрэч так яшчэ і цяплей. Мужчына, як вядома, апранае тое, што першым вывалiцца з шафы, эканомячы такім чынам безліч часу. А жанчына? Існуе паданне, што сярод іх сустракаюцца тыя, хто адчыняе шафу, ужо загадзя ведаючы, што апрануць... Акрамя таго, мужчыны эканомяць шмат грошай на касметыцы, упрыгажэннях, дарагой сподняй бялізне. Праўда, ім усё роўна даводзіцца гэта набываць, але ўжо для сваёй жанчыны. Таму гэты пункт у нашым «рэйтынгу» прапаную не залічваць у якасці перавагі.

Рамантычная вячэра для мужчыны — гэта набыты букет і прэзерватывы, а не вахта каля кухоннай пліты. Памятаеце жарт колішняга «зорнага» саставу беларускай каманды КВЗ БДУ: «Раней піражок каштаваў тры капейкі, прэзерватыў — дзве. Гэта ж як можна было пагуляць на пяць капеек!» Дарэчы, мужчына ніколі не камплексуе, што яго каронная страва — піца (яешня, пельмені, макарона). А ўменне прыгатаваць нешта крыху больш складанае, чым смажаная бульба, павышае яго «акцыі» да завоблачных вяршынь. А вось адсутнасць такіх талентаў у жанчыны лічыцца як мінімум маветонам.

А яшчэ ў мужчыны не бывае свекрыві. Толькі дзеля гэтага ўжо можна нарадзіцца мужчынам. Цешча і цесць, калі знайсці з імі агульную мову (шантаж, подкуп, падлашчванні, пагрозы — усе сродкі падыходзяць), яшчэ і на тваім баку будуць пры спрэчках з жонкай. Як у тым анекдоце: «Купіў сасіскі. Паклаў у халадзільнік. Потым захацеў іх з'есці — не знайшоў. Гляджу, цесць задаволены ходзіць. І тут да мяне дайшло! Сасіскі — у цесцю!»

Мужчына можа пісаць першым, званіць першым, чакаць каля пад'езда ці пасля працы. На яго прыстойнасці гэта ніяк не адаб'ецца. Большасці мужчын хапае для тэлефоннай размовы 15 секунд. А жанчына, якая размаўляла менш за 40 хвілін, папросту памылілася нумарам. Мужчына не камплексуе, калі на якой вечарынцы бачыць іншага мужчыну, апранутага гэтак жа, як і ён. Гэты факт аўтаматычна лічыцца чарговым тостам — за знаёмства. Каб з'ездзіць у адпачынак, мужчыну для рэчаў хапае адной дарожнай сумкі. Чарга ў мужчынскую прыбіральню заўсёды меншая і рухаецца хутчэй...

Працягваць можна было б і надалей, бо адрозненняў паміж мужчынамі і жанчынамі нашмат больш. Толькі... Мабыць, нас таму і цягне адно да аднаго, што мы шукаем тое, чаго няма ў саміх. Таму і жывецца нам добра — разам...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

Тайнае і яўнае

СТАНЬ САБОЙ — І ЖЫВІ ЯРКА!..

Студэнты БДУІРа Багдан Грыцавец і Ігар Сяткоўскі вырашылі рэалізаваць уласны праект, нечым падобны на... знакамітыя «курсы пікапу», але, на маю думку, шырэйшы. Хлопцы агранізоўваюць семінары, мэта якіх — дапамагчы маладым людзям абодвух палоў атрымліваць асалоду ад жыцця, пазбаўляцца ад комплексаў і ўдала ладзіць свае асабістыя стасункі.

Быць вялікім ці маленькім?

Некалькі гадоў таму хлопцы неяк разгаварыліся пра дзяўчат і пра розныя праблемы, якія ўзнікаюць падчас стасункаў з супрацьлеглым полам. Пасля абмену інфармацыяй пра «перамогі» на любоўным фронце хлопцы дамовіліся пайсці на Нямігу — з мэтай знаёмства. Пайшлі не з «пустымі рукамі» — прыдумалі цэлую анкету і падыходзілі да дзяўчат пад выглядам правядзення сацыяльнага апытання.

— Мы атрымалі нерэальную колькасць пазітыўных эмоцый, — прыгадвае Ігар. — І, зразумела, вопыт стасункаў з прыгожым полам.

Але такія аўтатрэнінгі атрымалі нечаканы працяг. Аднойчы Багдану прыйшла ў галаву ідэя дапамагаць сарамлівым старшакласнікам і студэнтам малодшых курсаў. Так узнік сумесны праект. Багдан і Ігар лічаць, што, калі яны самі змаглі пазбавіцца ад комплексаў, то і іншым здольны дапамагчы.

— Я добра ведаю праблемы пабудовы ўзаемаадносін, з якой сутыкаюцца юнакі, — расказвае хлопец. — Раней я таксама быў вельмі замкнёным і сарамлівым. Аднойчы па дарозе ва ўніверсітэт пазнаёміўся з дзяўчынай і запрасіў яе на спатканне. Яно мелася адбыцца ў прыгожым месцы, дзе ёсць выхад на дах. Дзяўчына прыйшла, але... аказалася абыякавай і да мяне, і да той атмасферы, якую я пастараўся стварыць.

Пасля «спаткання» ў Багдана быў дрэнны настрой, і ён падзяліўся сваімі перажываннямі з выкладчыкам, у праекце якога быў заняты. Той замест адказу намаляваў вялікі круг:

— Вось гэта ты, Багдан. Такі вялікі, цікавы, са сваімі дасягненнямі і патэнцыялам.

Пасля выкладчык намаляваў маленькі круг:

Трэнінг ля опернага тэатра.

Адзін са стваральнікаў праекта Багдан Грыцавец.

— І гэта таксама ты. Менавіта так бачыць цябе тая дзяўчына. Дык падумай, ці патрэбна табе тая, якая так да цябе ставіцца?

Гэта працвярэзіла хлопца. І цяпер ён праводзіць такое ж практыкаванне, калі працуе з маладымі людзьмі, якія прыходзяць на семінары.

Семінары «па-амерыканску»

Спачатку Ігар і Багдан бачылі ў якасці сваіх слухачоў найперш закамплексаваных старшакласнікаў і студэнтаў. Але пасля сутыкнуліся з тым, што некаторыя маладыя людзі не могуць наладзіць асабістае жыццё і да трыццаці гадоў. І не таму, што не хочуць.

— Для іх гэта ўжо сапраўдная праблема: час заводзіць сям'ю, а няма з кім, — адзначае Багдан Грыцавец.

Вось і атрымалася, што мэтавая аўдыторыя падзялілася на дзве часткі: старшакласнікі, студэнты — з аднаго боку, і больш сталыя людзі — з другога.

Методыка хлопцаў, якая павінна дапамагчы слухачам стаць больш свабоднымі і смелымі ў адносінах з процілеглым полам, уключае некалькі пунктаў. Па-першае, гэта семінары, на якіх аналізуюцца праблемы канкрэтных людзей і вядзецца пошук шляхоў іх вырашэння. Прапанаваць сваё выйсце з сітуацыі можа любы.

— У той жа Амерыцы гэта вельмі распаўсюджана, — адзначае мой суразмоўца, — а ў нас, наадварот, на такія трэнінгі пакуль глядзяць з недаверам. Людзі, як правіла, баяцца гаварыць пра свае праблемы ўслых, усё трымаюць у сабе. У выніку гэта выліваецца ў дэпрэсію ці стрэс.

Да нядаўняга часу сустрэчы былі толькі для моцнай паловы чалавецтва — так званы «мужчынскі клуб». Цяпер з'явіўся яго аналаг і для дзяўчат. Як правіла, прыблізныя тэмы і праблемы, якія будуць абмяркоўвацца на сустрэчах, паведамляюцца загадзя ў тых жа суполках у сеціве. Напрыклад, вось «парадак дня» для хлопцаў: «Мне падабаецца дзяўчына, але не магу (саромеюся) падысці да яе. Што рабіць?», «Мая дзяўчына раўнуе мяне. Я злуюся з-за гэтага. Дапамажыце!», «Я — кароль «фрэндзоны» (дзяўчаты бачаць мяне толькі ў якасці сябра). Як выйсці з гэтага становішча?»

Па-другое, гэта так званыя «выхады ў людзі». Наведвальнікі курсаў Багдана і Ігара выходзяць у месцы, дзе, як правіла, гуляе шмат дзяўчат, і знаёмяцца з імі. Там на вачах хлопец са сціплага і маўклівага ператвараецца ў кампанейскага жартаўніка або без комплексаў распранаецца і купаецца ў фантане з незнаёмымі дзяўчатамі.

Стаць «я-ідэальным»

Мэта заняткаў — максімальна наблізіцца ў рэальнасці да таго, кім чалавек хацеў бы стаць. Таму наладжванне адносін з супрацьлеглым полам — безумоўна, важна, але не толькі гэта робіць наша жыццё больш яркім. Важна зрабіць так, каб кожны дзень прыносіў карысць і задавальненне, каб здзяйсняліся нейкія «простыя» жаданні, якія адкладваліся да гэтага «на пасля». Напрыклад, не так даўно хлопцы арганізоўвалі скачкі з парашутам для ўсіх ахвотных.

Максім Вараб'ёў скончыў БДТУ і зараз ужо працуе. На семінары пачаў прыходзіць перш за ўсё дзеля таго, каб правесці час у добрай кампаніі, але потым стаў прымаць актыўны ўдзел у праекце:

— Спачатку я хадзіў на ўсе сустрэчы, якія арганізоўвалі Багдан і Ігар, а пасля яны прапанавалі мне і самому ўдзельнічаць у падрыхтоўцы да семінараў і ў іх правядзенні. Мы ўжо адкрылі ў рамках праекта клуб «Аб чым гавораць мужчыны» і «Аб чым маўчаць дзяўчаты». У хуткім часе плануем адкрыць «Карпарацыю М+Ж», дзе прадстаўнікі абодвух палоў змогуць абмяркоўваць набалелыя пытанні.

Аляксей Казачонак скончыў БДУІР у 2011 годзе. Кажа, што на семінарах яму падабаецца атмасфера:

— Прыходзіш — і атрымліваеш зарад пазітыўнай энергіі, адпачываеш. Для мяне сустрэчы, якія ладзяцца ў рамках праекта, — гэта добры спосаб падурэць!

А яшчэ і хлопцы, і дзяўчаты могуць прыйсці і разам паўдзельнічаць у ралявой гульні «Вастраў страху». Калі ў традыцыйнай «Мафіі» ёсць «мафіёзі», ёсць «гараджане», якія павінны выкрыць мафію, і вядучы, то ў «востраве», акрамя «турыстаў» і «ваўкалакаў» ёсць «маньяк», «ведзьма» і іншыя персанажы. Сціплым у гульні можна заставацца толькі ўпачатку, а пасля трэба праяўляць сябе, адпавядаць сваёй ролі.

Усё як у жыцці. Багдан і Ігар спадзяюцца, што іх семінары дапамогуць людзям выбраць тую ролю, якая дазволіць проста быць сабой і не саромецца гэтага.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 22.898.
Нумар падпісаны ў 19.30 25.09.2013 г.

РЫНАК У ЧАКАННІ ПЕРАМЕН...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Што тычыцца прасторных аднапакаёвых кватэр у цэнтральных раёнах сталіцы, то цэны там увогуле зашкальваюць. Памяшканні плошчай каля 40-45 «квадратаў» прапануюцца ўжо за 80-95 тысяч долараў.

Танная двухпакаёўка — мінімум 65 тысяч долараў

Паводле інфармацыі Мікалая Прасталупава, сярэдні кошт квадратнага метра стандартных двухпакаёвых кватэр панэльных дамоў у спальных раёнах Мінска пры рэальных здзелках складае каля 1650-1700 долараў. Тут цэннік «квадрата» залежыць ад якасці і плошчы кватэры. Калі двухпакаёўка не вельмі «дабітая» і адначасова маленькая, то кошт квадратнага метра там будзе даражэйшы.

Квадратны метр кватэр, што будуць пабудаваны ў 3 квартале наступнага года ў мікрараёне Каменная Горка-2, каштуе ўжо 1500 долараў.

У старых дамах на крайніх паверхах магчыма адшукаць і параўнальна танныя двухпакаёўкі, дзе стандартныя 43 квадратныя метры будуць каштаваць 65—70 тысяч долараў. Эксперты рынку нерухомасці падлічылі, што менш чым за два месяцы мінімальны кошт двухпакаёвак павялічыўся прыкладна на 3-4 тысячы долараў. Аднак больш-менш прывабныя двухпакаёвыя кватэры каштуюць ужо не менш як 73-80 тысяч. Самая вялікая колькасць прапаноў прыпадае на двухпакаёўкі ў панэльных 9-павярховых дамах з цэннікам ад 80 да 120 тысяч.

Сярэдні кошт прапановы квадратнага метра трохпакаёвых кватэр цяпер складае 1600-1650 долараў. Атрымліваецца, што вельмі маленькая трохпакаёўка агульнай плошчай да 53 квадратных метраў каштуе 75-78 тысяч. Крыху лепшыя па якасці шматпакаёвыя кватэры каштуюць ужо не менш як 100—120 тысяч долараў. Менавіта гэты сегмент жыллёвай нерухомасці сёння яшчэ вельмі моцна не падаражэў. Дарэчы, пакуль.

Нетрадыцыйнае лета

Спецыялісты ўпэўнены, што адна з прычын павышанага попыту гэтым летам на «другасным рынку» — змяншэнне аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў межах горада.

Акрамя таго, летась была скарочана чарга тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Некаторыя з іх, разумеючы, што чакаць на першасным рынку ўжо няма чаго, перайшлі на другасны і сталі скупляць танныя кватэры, рэзка падняўшы на іх попыт. Гэта выклікала няўхільны рост цэн. Штомесяц яны падымаліся на 2-4%. Тады пакупніцкая актыўнасць прывяла да звужэння другаснага рынку жылля ў сталіцы. Калі ў пачатку бягучага года прапаноўвалася 4153 кватэры, то ў сярэдзіне жніўня — каля 3,5 тысячы жылых памяшканняў. У першым паўгоддзі ў сталіцы здзейснена 6813 здзелак з кватэрамі, што на 30% больш у параўнанні з аналагічным перыядам летась.

Відавочна, што гэтым летам было «павымывана» шмат танных і ліквідных кватэр. А вось у другой палове жніўня актыўнасць кліентаў пачала зніжацца.

Перспектывы на кастрычнік даволі прывідныя

Паводле інфармацыі нашага эксперта, і ў верасні на другасным рынку жылля захавалася складанае становішча па колькасці здзелак, якіх больш не становіцца. Цяпер выяўляецца тэндэнцыя і на кастрычнік, бо ўдзельнікі рынку прытрымліваюцца пазіцыі чакання. Чакання чаго?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ КВАТЭР АКТЫВІЗАВАЛАСЯ

У службах «адно акно» адміністрацый раёнаў сталіцы і Мінгарвыканкама за апошні час адзначаецца рэзкае павелічэнне зваротаў грамадзян з нагоды прыватызацыі жылля. Так, у студзені—жніўні гэтага года было прынята каля 25 тысяч такіх зваротаў, у тым ліку з мая па жнівень — больш за 21 тысячу.

Усяго за 8 месяцаў гэтага года службу «адно акно» наведалі звыш 221 тысячы чалавек, што на 34% больш у параўнанні з аналагічным перыядам летась. Па-ранейшаму, значная частка грамадзян звяртаецца ў службу «адно акно» з заявамі аб ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур па жыллёвых пытаннях (56 % агульнай колькасці пададзеных заяў).

Кошт квадратнага метра ў спальных раёнах Мінска пры рэальных здзелках складае каля 1650-1700 долараў.

Мікалай Прасталупаў упэўнены, што галоўным «інструментам» уздзеяння на сектар жыллёвай нерухомасці з'яўляецца псіхалагічны фактар, калі дасягнуты ўзровень цэн ужо неадэкватны існуючым даходам патэнцыяльных пакупнікоў. Тут існуюць і альтэрнатыўныя думкі незалежных экспертаў на гэты конт. На іх думку, кліенты апошнім часам пачынаюць звязваць тэндэнцыі на другасным рынку жылля з магчымымі зменамі ў сектары валютнай палітыкі краіны. Адзначу, што раней валютныя ваганні даволі істотна паўплывалі на цэннік жылля. Звычайна цэны на кватэры ў валютным эквіваленце тады зніжаліся. Аднак і ў гэтым выпадку ад сябе асабіста заўважу, што інтуіцыя і логіка ў сектары айчыннай жыллёвай нерухомасці ў дуэце «працуюць» рэдка.

Новых камерцыйных забудоўшчыкаў пакуль амаль няма

Зразумела, што на цэнавыя ваганні другаснага рынку сталічнага жылля даволі істотна паўплывае сітуацыя з развіццём камерцыйнага жыллёвага будаўніцтва. Калі на першасным рынку жылля Мінска будуць прапаноўвацца сапраўды танныя варыянты, тады і старыя кватэры моцна даражэць не павінны.

Разам з тым, свежай прапановы на першасным рынку жылля пакуль так і не з'явілася. Адкрытае акцыянернае таварыства «ТАМБАЗ» прапануе ў жылым комплексе па вуліцы Багдановіча толькі 3- і 4-пакаёвыя кватэры. Дом будзе здадзены ў эксплуатацыю толькі ў 4 квартале 2016 года. Менавіта таму кошт квадратнага метра тут складае ад 9,5 млн рублёў. Калі дом ужо будуецца, а ўвод аб'екта ў эксплуатацыю запланаваны сёлета ці ў наступным годзе, то і кватэры там даражэйшыя. Напрыклад, квадратны метр кватэр, што будуць пабудаваны ў 3 квартале наступнага года ў мікрараёне Каменная Горка-2, каштуе ўжо 1500 долараў. Тут трэба ўлічваць той факт, што аплачваць трэба поўны кошт жылля, а кватэры кліент атрымае толькі «паслязаўтра» і без апрацоўкі. А які прагноз на заўтра? Пасля таго, як праблемай даўгабуду жылля зацікавіўся сам кіраўнік дзяржавы, на будаўнічых аб'ектах пачалі наводзіць парадак. А ў выніку цяпер горад вырашыў увогуле часова не даваць будпляцоўкі пад жыллё сумніўным прыватным арганізатарам інвестпраектаў.

Без масавага будаўніцтва на новых плошчах праблема «забуксуе»

Цяпер усе ўдзельнікі жыллёвага будаўніцтва сталіцы згаджаюцца з тым, што Мінск без масавага камерцыйнага будаўніцтва праблему жылля не вырашыць. «Зрабіць» горад толькі за кошт ільготных крэдытаў сёння немагчыма. Мікалай Прасталупаў упэўнены, што трэба актыўна, без нейкіх надуманых абмежаванняў, выдаваць зямельныя ўчасткі сур'ёзным удзельнікам інвестыцыйных праектаў. Уздоўж кальцавой дарогі яшчэ хапае свабоднай зямлі, лічыць наш эксперт. А вось калі гэтага не зрабіць сёння, то кошт жыллёвага квадрата павялічыцца да 2000 долараў ужо ў першыя месяцы наступнага года, лічыць спецыяліст.

Сяргей КУРКАЧ.

TAX-FREE АДКЛАДАЕЦЦА ДА ЗІМЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сістэма Tax-Free выгадная для эканомікі тым, што таваразварот расце за кошт замежных пакупнікоў. Яна таксама прызначана павялічваць паток турыстаў (для беларусаў не навіна шоп-туры ў Польшчу, Літву). Для Беларусі гэта асабліва актуальна перад чэмпіянатам свету па хакеі 2014 года.

Як было сказана вышэй, Беларусь далучылася да Tax-Free з 1 студзеня 2013 года. Умовы для замежных пакупнікоў наступныя. Мінімальны кошт пакупак складае 800 тысяч рублёў. Тавар трэба набыць у адной краме. Падатак не вяртаецца, калі тавар у Беларусі вызвалены ад ПДВ, да яго прымяняецца паніжаная стаўка (дзіцячыя тавары і прадукты харчавання) ці гэта падакцызны тавар (алкаголь, цыгарэты).

За мяжой

Еўрапейскія крамы ўжо даўно практыкуюць Tax-Free. Магчымасць вярнуць частку грошай робіць замежны шопінг яшчэ больш прывабным. Tax-Free можна афармліць нават на прадукты харчавання (акрамя алкаголю і цыгарэт)!

Возьмем крамы Вільнюса. У які з аддзелаў буйнога гандлёвага цэнтра не зойдзеш, убачыш ці блакітную налепку «Tax-Free» на дзвярах, ці такую ж брашуру каля касы. У чарзе заўважыш не аднаго кліента з расійскім ці беларускім пашпартам. Пры разліку яны смела просяць афармліць ім Tax-Free. Відаць, што карыстаюцца гэтай паслугай не ўпершыню. А добразычлівыя прадаўцы заўсёды растлумачаць, што да чаго, калі іншаземец да гэтага ніколі не афармляў Tax-Free.

У Мінску

Нагадаю, што ўвядзенне сістэмы Tax-Free ў Беларусі арганізавана да чэмпіянату свету па хакеі, што адбудзецца ў 2014 годзе. Афіцыйна ў сталіцы тры крамы (ГУМ, ЦУМ і гандлёвы дом «На Нямізе») забяспечваюць паслугу Tax-Free. Я вырашыла праверыць, ці здатныя там дапамагчы замежнаму пакупніку.

Адразу заходжу «На Нямігу». Першае, што кідаецца ў вочы — адсутнасць налепак, брашур «Tax-Free». Пытаюся ў жаночым аддзеле, як я магу скарыстацца гэтай паслугай. Прадаўшчыца адразу пачынае расказваць, што ў іх на касавым чэку ставіцца штамп і ўказваецца велічыня ПДВ. «А забраць грошы вы зможаце ў банку, аэрапорце, на мытні пры выездзе з краіны», — тлумачыць мне жанчына.

Наступны прыпынак — ЦУМ. Там мне нічым не дапамаглі. Прадавец з ювелірнага аддзела сказала, што ў краме нельга афармліць Tax-Free.

Засталося прайсці праз праверку журналіста толькі ГУМу. Звяртаюся да дзяўчыны за касай аддзела тэхнікі:

— Скажыце, як я магу афармліць у вас Tax-Free?

— Што? Таксі? Вам туды...

— Не, не таксі, а Tax-Free.

— А што гэта?

Тлумачу.

— Схадзіце ў цэнтр інфармацыі. Калі мы аказваем такую паслугу, то, хутчэй за ўсё, там ведаюць.

Вырашэнне тэхнічных пытанняў замінае таму, каб прывесці Tax-Free ў дзеянне. Трэба замяняць касавыя апараты, наладжваць усю сістэму, каб турысты маглі вяртаць свае грошы.

У акне даведкі мне адмоўна махаюць галавой і кажуць, што сістэма Tax-Free ў іх краме не дзейнічае. Я пытаюся, чаму. «Гэтае пытанне не да нас, — кажуць мне. — А да каго? — Не ведаю. Мне вядома толькі, што сістэма ў распрацоўцы».

Тэлефаную у Белмытсэрвіс, афіцыйны аператар Tax-Free ў Беларусі. «Сістэма запрацуе з 1 кастрычніка. Але мы не кантактуем з прэсай па гэтым пытанні. Звярніцеся ў Мінгандаль», — раяць мне.

У Міністэрстве гандлю на маё пытанне аб тым, калі запрацуе сістэма па вяртанні ПДВ замежнікам, адказалі, што са снежня. Вырашэнне тэхнічных пытанняў замінае таму, каб прывесці Tax-Free ў дзеянне. Трэба замяняць касавыя апараты, наладжваць усю сістэму, каб турысты маглі вяртаць свае грошы. У міністэрстве чакаюць замежных партнёраў, якія змогуць падзяліцца сваім вопытам.

Як бачым, сістэма Tax-Free ў Беларусі пакуль не вельмі актыўная. У некаторых буйных крамах нават не ведаюць, што гэта такое. І калі яна будзе дакладна дапрацавана, таксама невядома. Спадзяюся, да таго часу, калі краіну чакае прыток турыстаў, паспеюць.

Вераніка ЦВІРКО.

Дарагія пляменнікі **Аляксандр** і **Наталля СМОЛІЧЫ** з Мінска!

У дзень крышталёвага вяселля прыміце мае сардэчныя віншаванні з пажаданнем берагчы сям'ю. Жадаю дабрабыту і раўнавагі ў сям'і.

Ваша Новік Т.І.

ЗДАРОЎЯ ДЫ ЯСНАГА СОНЕЙКА!

Ніскі паклон **ветэранам былога калгаса імя Калініна**, у тым ліку **старэйшай жыхарцы КАЧАНОЎСКАЙ Надзеі Сцяпанаўне** (ёй 93 гады, з іх 27 працавала ў сельгасарцелі). З пачуццём шчырай удзячнасці за старанную працу ў калгасе віншую нашых даўгалетніх жыхароў з надыходзячым Днём пажылых людзей. Няхай наша цёплае слова сагрэе вашы сэрцы, напомніць цудоўныя гады маладосці. Жадаем вам здароўя, бадзёрага настрою ды яснага сонейка.

Ад імя праўлення і камітэта прафсаюза Генадзь Станіслававіч ХАРАВЕЦ, старшыня СВК «Рухчанскі» Столінскага раёна.

УНП 200147304

З КВЕТКАМІ І ВЯСЁЛЫМ ЗАСТОЛЛЕМ

Наша шчырае віншаванне з Днём пажылых людзей — **ветэранам ранейшага калгаса «Ленінскі шлях»,** а таксама даўгалетнім **жыхарам нашай і суседніх вёсак**. Жадаем ранейшага аптымізму ў жыцці, шчодрага даўгалецця, а ў дзень урачыстай падзеі сапраўднага свята з багатым караваем, кветкамі і вясёлым застоллем.



Ад імя праўлення і прафкама Генадзь Уладзіміравіч НАЗДРЫН, старшыня СВК «Варані» Столінскага раёна.

УНП 200114830

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 29.10.2013 г. в 10.00 по адресу: 210600, г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, конференц-зал.
Организатором аукциона является

РУП «Белтелеком» в лице Витебского филиала РУП «Белтелеком»,

находящегося по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19.

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

Помещения 2-го этажа в капитальном строении (здание административно-хозяйственное), в хорошем техническом состоянии, общей площадью 47,0 кв.м по ул. 14-я Полоцкая, 35А/1 в г. Витебске:

Лот 1. Помещение 11,5 кв.м, начальная цена продажи – 2,875 базовых арендных величин; размер задатка – 0,2875 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

Лот 2. Помещение 21,5 кв.м, начальная цена продажи – 5,375 базовых арендных величин; размер задатка – 0,5375 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

Лот 3. Помещение 14,0 кв.м, начальная цена продажи – 3,5 базовых арендных величин; размер задатка – 0,35 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

Лот 4. Помещение 1-го этажа в изолированном помещении (административное помещение), общей площадью 8,71 кв.м по ул. Чкалова, д. 24/8, пом.1 в г. Витебске в нормальном техническом состоянии, начальная цена продажи – 2,1775 базовых арендных величин; размер задатка – 0,21775 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 3,0.

Лот 5. Помещения 1-го этажа со вспомогательными площадями в капитальном строении (автоматизированная телефонная станция-2), общей площадью 69,7 кв.м (помещения: 22,1; 22,1; 22,1), вспомогательные помещения: 3,4 кв.м (в т.ч. 0,2; 0,8; 0,2; 0,2; 0,8; 0,2; 0,5; 0,5)) по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцк Витебской области, удовлетворительного состояния, начальная цена продажи – 17,425 базовых арендных величин; размер задатка – 1,7425 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 2,5. Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звезда» № 90 от 21.05.2013 г.

Лот 6. Помещения на 3-м этаже в капитальном строении (автоматизированная телефонная станция-2), общей площадью 32,1 кв.м по адресу: ул. Якуба Коласа, 14 в г. Новополоцк Витебской области, удовлетворительного состояния, начальная цена продажи – 8,025 базовых арендных величин; размер задатка – 0,8025 базовых арендных величин; коэффициент (п.8.2 Указа №150) составляет 2,5. Первоначально извещение о проведении открытого аукциона опубликовано в газете «Звязда» №82 от 04.05.2013 г.

Срок аренды – не менее 3-х лет; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Документы на участие в аукционе принимаются с 27.09.2013 г. по 28.10.2013 г. в рабочее время (с 9.00 до 17.00), по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п. Документы, поданные после 17.00 28.10.2013 г., не рассматриваются. Заключительная регистрация участников аукциона в день проведения аукциона с 9.00 до 10.00 по адресу: г. Витебск, пр-т Черняховского, 19, каб. 509-п.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на с/с № 3012072841543 в филиале № 200 – Витебском областном управлении ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300977657 Витебский филиал РУП «Белтелеком»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Срок заключения договора аренды: в соответствии с действующим законодательством.

Телефоны для справок (0212) 27-29-42, 27-11-58, факс (0212) 27-18-81.

e-mail: kovalenko_ea@vitebsk.beltelecom.by

УНП 300063038

ИЗВЕЩЕНИЕ

ВЕРХНЕДВИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
на право заключения договора аренды земельного участка, который состоится 30 октября 2013 г. в 15.00 в здании Верхнедвинского райисполкома по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1 (малый зал заседаний, 2-й этаж).

На аукцион будет выставлен: земельный участок с кадастровым номером 221080601601000332, расположенный по адресу: Витебская область, Верхнедвинский район, агрогородок Бигосово, улица Молодежная, площадью 0,0030 га, для установки торгового павильона, срок аренды – 10 лет, начальная цена предмета аукциона – 13623 рубля, размер задатка – 1400 рублей.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) с 30 сентября по 25 октября 2013 г. (включительно) по адресу: г. Верхнедвинск, ул. Кооперативная, 1, кабинет 64. Заключительная регистрация участников 30 октября 2013 г. с 14.00 до 14.45 по тому же адресу. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Контактный телефон в г. Верхнедвинске: 8 (02151) 5-28-97.

Подробная информация о проведении аукциона, условиях продажи размещена на сайте Верхнедвинского райисполкома: verkhnedvinsk.vitebsk-region.gov.by.

УНП 600230217

МИНСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ ОТКАЗЫВАЕТСЯ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ 18 октября 2013 года

в отношении следующих земельных участков:

1) Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1525 га, Минский район, Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 114, кадастровый номер земельного участка 623684301601000495. (Лот 8).

2) Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1534 га, Минский район, Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 149, кадастровый номер земельного участка 623684301601000413. (Лот 9).

3) Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1534 га, Минский район, Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 156, кадастровый номер земельного участка 623684301601000355. (Лот 10).

4) Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1462 га, Минский район, Новодворский с/с, аг. Гатово, участок № 167, кадастровый номер земельного участка 623684301601000347. (Лот 11).

5) Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома площадью 0,1488 га, Минский район, Новодворский с/с, д. Мацевичи, участок № 5, кадастровый номер земельного участка 623684305101000110. (Лот 13).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. БРЕСТЕ

№ лота	Адрес участка/ кадастровый номер	Кадастровый номер 14010000000	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Срок аренды, лет	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	ул. Московская, 204	1027966	0,0166	строительство и обслуживание станции газификации	10	11 385 747	2 270 000	7 004 742	0,0166 га – водоохранная зона реки Мухавец
2	ул. Дубровская	1027963	0,0019	установка и обслуживание торгового павильона	10	1 294 057	250 000	5 885 714	ограничений в использовании земель нет
3	ул. Красногвардейская, 2	1027946	0,0096	установка и обслуживание торгового павильона	10	12 448 276	2 480 000	6 294 164	0,0018 га – охранная зона подземной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0024 га – охранная зона подземной линии электропередачи напряжением свыше 1000В
4	ул. Волгоградская, 8	1027943	0,0008	установка и обслуживание торгового павильона	10	827 781	165 000	5 859 239	ограничений в использовании земель нет
5	ул. Гродненская, 29/2	1027938	0,3013	строительство и обслуживание производственной базы	10	137 753 901	27 550 000	5 527 379	0,0445 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряж. 110 кВ; 0,0356 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения среднего давления
6	ул. Героев обороны Брестской крепости, 3/1	1027944	0,0801	строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей с объектом торговли автозапчастями	10	80 129 755	16 020 000	6 121 444	0,0082 га – водоохранная зона реки Мухавец; 0,0801 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0368 га – охранная зона сетей и сооружений канализации; 0,0005 га – охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения
7	ул. Гоздецкого	1027939	0,0936	строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей	10	42 793 777	8 550 000	5 859 239	ограничений в использовании земель нет
8	Южный городок, 37	1027945	0,0319	установка и обслуживание павильона шиномонтажа	3	7 097 602	1 410 000	6 264 960	ограничений в использовании земель нет
9	на пересечении ул. Костюшко и ул. Московская	1027940	1,1375	строительство и обслуживание бизнес-центра и торгового объкта «Сад, огород, товары для дома и мебели»	10	402 270 278	80 450 000	6 014 738	0,1614 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 10 кВ; 0,0125 га – охранная зона подземной линии электропередачи напряжением 10 кВ; 0,0088 га – охранная зона подземной кабельной линии электросвязи и радиофикации; 0,2685 га – в придорожной полосе (контролируемых зонах) автомобильных дорог
10	ул. Вульковская	1027942	0,1688	строительство и обслуживание офисно-медицинского центра	10	179 085 423	35 810 000	5 910 418	ограничений в использовании земель нет
11	между ул. Октябрьской Революции и ул. 28 Июля	1020990	3,5375	строительство и обслуживание объекта торгово-развлекательного назначения, административного назначения, гостиницы с условиями создания на прилегающей территории ландшафтно-рекреационной зоны	10	3 150 636 580	630 120 000	3 143 097	ограничений в использовании земель нет
12	между № 41, 42 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-3»	1025056	0,5272	строительство и обслуживание торгово-административного центра	10	448 845 291	89 760 000	1 366 583	ограничений в использовании земель нет
13	ул. Т. Костюшко	1027964	1,2493	строительство и обслуживание блокированных жилых домов	10	77 259 705	15 450 000	833 866	ограничений в использовании земель нет
14	ул. Воинов-интернационалистов, 19	1019530	0,0673	строительство и обслуживание объектов социально-бытового назначения, торговли и общественного питания	10	67 873 444	13 570 000	5 795 970	0,0117 га – охранная зона газопровода среднего давления
15	ул. 2-я Белорусская	1019335	0,8704	строительство и обслуживание объекта производственного назначения	10	355 798 999	71 150 000	1 450 817	0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления
